

ЕЎРА СЛАБЕЕ **3**



РЭЖЫСУРА, НАТХНЁНАЯ КАРАНЯМІ **6**

16 ЛІПЕНЯ 2022 г.
СУБОТА
№ 138 (29760)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

# «НАШ ДЭВІЗ «ПРАЗ МАСТАЦТВА — ДА МІРУ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ» ЗНОЎ АКТУАЛЬНЫ ЯК НІКОЛІ»

### Аб чым Прэзідэнт Беларусі гаварыў на адкрыцці XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»



Фота БелТА.

**Ужо стала традыцыяй, што Аляксандр Лукашэнка прысутнічае на адкрыцці віцебскага фестывалю. Летні амфітэатр сустрэў кіраўніка дзяржавы шчырымі авацыямі. «Я яшчэ не заслужыў такіх авацый, але я буду старацца. Дзякуй», — адказаў ён.**

Вітаючы доўгачаканых шматлікіх гасцей кіраўнік дзяржавы заўважыў, што зноў на старажытнай віцебскай зямлі гучаць пазыўныя «Славянскага базару». У іх мелодыі зліліся разам гукі любімых песень, галасы сапраўды народных артыстаў, апладысменты самай душэўнай, шчырай і адкрытай публікі, якая сабралася ў Летнім амфітэатры.

«У гэтых апладысментах гучыць шматвяковая гісторыя ўнікальнай славянскай культуры, якая ўзбагаціла свет незвычайнай духоўнасцю, глыбінёй і прыгажосцю. Гэтыя гукі зноў, як і ўсе папярэднія гады, знайшлі жывы водгук у сэрцах тысяч людзей, якія прыехалі ў Беларусь, нягледзячы на адлегласці і, на жаль, перашкоды. І гэта сведчанне таго, што мастацтва вечнае, а імкненне народаў да сяброўства і міру пераадольвае любыя перашкоды», — сказаў ён.

Па словах Прэзідэнта, у сучасным вар'яцкім свеце, які адмяняе культуру і мовы, які падзяляе людзей па нацыянальных і іншых прыкметах, фестываль стаў ці не адзінай жыватворнай крыніцай. Крыніцай стварэння і новых здзяйсненняў. Ён заўважыў, што такая святочная і творчая атмасфера найменш спрыяе размовам пра палітыку. Але лёс «Славянскага базару» з першага свайго дня звязаны менавіта з дадзенай тэмай.

«І мы правільна зрабілі, што захавалі наш фестываль тады, у цяжкія 1990-я. Наш дэвіз «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» зноў актуальны як ніколі. А ствараючы гэты форум, мы і падумаць не маглі, што адзіны славянскі свет, магутны сваёй тысячагадовай гісторыяй, будзе пастаўлены ва ўмовы палітычнага і культурнага выжывання. Што будуць страчаны простыя чалавечыя каштоўнасці, такія важныя ў адносінах паміж краінамі і народамі: сяброўства, давер, шчырасць. Мы нават не маглі ўявіць, што з палітычнай карты знікне дружалюбная нам Югаславія, постсавецкая прастора пагрузіцца ў шэраг узброеных канфліктаў. А ваенны блок НАТА пашырыцца на ўсход, раскідаўшы славян па розныя бакі барыкад», — падкрэсліў беларускі лідар.

## НАША СЛАВЯНСКАЯ ДУША ЎСЁ ВЫТРЫМАЕ

Аднак, па словах Аляксандра Лукашэнкі, самы разбуральны ўдар быў нанесены восем гадоў таму проста ў сэрца славянскага свету — у беларуска-расійска-ўкраінскае брацтва.

«І як бы сёння ні пераварочвалі гісторыю з ног на галаву, мы страцілі Украіну задоўга да пачатку спецаперацыі. Тады, калі яе палітыкі самі адмовіліся ад славянскай ідэнтычнасці. Калі ў нас цудам атрымлівалася прывесці на гэтую сцэну ўкраінцаў, нават тых, якія даўно жывуць у іншых краінах. Але чаго б нам гэта ні каштавала, на адкрыцці «Славянскага базару» гучала ўкраінская мова. І будзе гучаць сёння! Больш за тое, яна будзе тут гучаць заўсёды!» — запэўніў ён.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што Украіна, брацкі ўкраінскі народ вернецца ў сваю сям'ю, і будзе зроблена ўсё магчымае, каб фестываль жыў. Каб сюды прыязджалі людзі з розных куткоў зямлі.

«І няхай ніхто не сумняваецца: наша славянская душа ўсё вытрымае, у чарговы раз перацерпіць, а ідэі дабра, міру і справядлівасці зноў пераможуць. Бо паглядзіце: як бы Захад ні спрабаваў аддзяліць нас жалезнай заслонай, да нас працягваюць прыязджаць госці з Еўропы і іншых кантынентаў», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы прывёў як прыклад тое, што білеты на канцэрты прадаюцца, гасцініцы перапоўненыя. У гэтыя дні ў Віцебску, зрэшты, як і заўжды, побач з беларусамі сапраўдныя сябры, якія падзяляюць пазіцыю і погляды на жыццё.

СТАР. 3

Прыёмная кампанія — 2022

# НАПЯРЭДАДНІ ВАЖНАГА СТАРТУ...

### Каб вызначыцца з прафесіяй, у абітурыентаў будзе сем дзён

**18 ліпеня ў краіне стартуе другі этап уступнай кампаніі: у гэты дзень прыёмныя камісіі ВНУ распачнуць прыём дакументаў ад абітурыентаў. Сёлета на бюджэтную форму навучання плануецца прыняць 27,7 тысячы чалавек і 25,8 тысячы — на платную.**

## ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

У структуры прыёму на бюджэт дамінуе дзённая форма навучання — яна складае больш за 80 працэнтаў ад лічбаў набору. А ў структуры прыёму на платную форму прасочваецца пэўны парытэт: каля 50 працэнтаў складае прыём на дзённую форму навучання. Невялікае павелічэнне набору на бюджэт адбудзецца па медыцынскіх, тэхнічных і асобных педагагічных спецыяльнасцях. Разам з тым, скарэктаваны прыём у бок памяншэння на незапатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці, у тым ліку на тыя напрамкі, дзе работадавец аддае перавагу больш вопытным спецыялістам з рынку працы: гэта эканоміка і юрыспрудэнцыя.

СТАР. 2



# Маміна школа

**Маладая маці з Мсціслава Ганна КУРДАСАВА з паўтарагадовым сынам Аляксандрам любіць гуляць у ваколіцах свайго старажытнага горада. Перад дэкрэтным водпускам Ганна працавала педагогам дадатковай адукацыі, а цяпер роля настаўніка для яе — у выхаванні свайго сыночка.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

«Звязда». 105 гадоў: адрасы газеты

# СПРАВА ГОНАРУ

### Людзі, якія стваралі падпольную «Звязду», змагаліся з акупантамі

**Побач з Камароўскім рынкам, які ведае кожны жыхар сталіцы, знаходзіцца сціплы помнік. Шэсць каменных літар зліваюцца ў адно слова — «звязда». У гады фашысцкай акупацыі на гэтым месцы стаяла хата, у якой былі надрукаваны другі і трэці нумары аднайменнай падпольнай газеты. Подзвіг людзей, якія мелі дачыненне да небяспечнай і ў той жа час высакароднай справы, быў увекавечаны пасля Вялікай Айчыннай вайны.**

У гэтую хату, што знаходзілася на вуліцы з сімвалічнай назвай — Выдавецкая (цяпер Кульман) — падпольная рэдакцыя пераехала пасля трагічных падзей, якія адбыліся з многімі ўдзельнікамі першага нелегальнага выпуску «Звязды». Яго рэдактара, Уладзіміра Амельянюка, гітлераўцы забілі, бацьку і сына Воранавых, у хаце якіх па вуліцы Рымарскай быў надрукаваны першы нумар, арыштавалі — у канцы 1942 года яны загінулі ў фашысцкім засценку. Трагічна склаўся лёс і ў наборшчыка Барыса Пупко...

Нягледзячы на тое, што ўсяго толькі за адзін газетны выпуск была заплачана такая высокая цана, выданне газеты вырашылі працягнуць. Роля і сіла друкаванага слова была навідавоку — невыпадкова за выкрыццё падпольнай рэдакцыі акупанты абяцалі заплаціць 75 тысяч нямецкіх марак, што па тым часе складала вялізныя грошы.

СТАР. 8




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп прыняў рашэнне ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах

**Былы прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў амерыканскім СМІ, што ён прыняў рашэнне аб сваім удзеле ў выбарах 2024 года. Такую інфармацыю прыводзяць РІА «Навіны».**



Ён заявіў, што рашэнне ўжо прынята. А таксама дадаў, што ўпэўнены ў сваёй перамозе ў выпадку ўдзелу ў найбліжэйшых выбарах прэзідэнта ЗША.

## Дзмітрый Рагозін, кіраўнік «Раскосмаса», можа сысці ў адстаўку ў найбліжэйшы час

**Кіраўнік «Раскосмаса» Дзмітрый Рагозін рыхтуецца пакінуць сваю пасаду ў хуткім часе. Пра гэта паведамляе выданне «МК» са спасылкай на свае крыніцы.**

Па звестках «МК», Рагозін можа заняць кіруючую пасаду на адной з тэрыторый ва Украіне, што кантралюецца расійскімі вайскоўцамі. Яго месца ў «Раскосмасе» зойме цяперашні віцэ-прэм'ер урада РФ Юрый Барысаў.

Некаторыя называюць месца кіраўніка дзяржкарпарацыі па касмічнай дзейнасці «расстрэльным» з-за розных праблем галіны, якія накапіліся, і яе адставання ад вядучых касмічных дзяржаў, адзначае «МК».

Выданне лічыць, што ў расійскіх уладаў ёсць надзея, што Юрый Барысаў справіцца з абавязкамі у «Раскосмасе», бо ў яго ёсць вопыт у сферы навукі і прамысловасці — ён з'яўляецца спецыялістам у сферы радыёэлектронікі СПА і шмат гадоў займаў кіруючыя пасады ва ўрадзе.

Дзмітрый Рагозін займае пасаду гендырэктара «Раскосмаса» з 24 мая 2018 года. Пры ім былі пачаты работы па другой і трэцяй чарзе будаўніцтва касмадрома «Усходні», пачата будаўніцтва аднайменнага аэрапорта на гэтым касмадроме, пачалося ўзвядзенне Нацыянальнага касмічнага цэнтра, стварэнне новага касмічнага карабля «Арляня», стартавала праектаванне Нацыянальнай арбітальнай касмічнай станцыі.

## МЗС Кітая крытычна паставілася да слоў Байдэна аб «лідарстве» Злучаных Штатаў на Блізкім Усходзе

**Афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Ван Вэньбінь заявіў, што Пекін крытычна паставіўся да выказвання прэзідэнта ЗША Джо Байдэна аб тым, што Вашынгтон лідзіруе на Блізкім Усходзе. Па словах дыпламата, аб ролі сваёй краіны ў тым ці іншым рэгіёне могуць разважаць толькі прадстаўнікі народаў, якія пражываюць на яго тэрыторыі, перадае ТАСС.**

Дыпламат, каментуючы выказванне амерыканскага прэзідэнта аб «выключным становішчы» ЗША, адзначыў, што блізкаўсходнія дзяржавы — гэта не чыйсьці «задні двор».

«У гэтым рэгіёне цяпер не вельмі спакойная сітуацыя. Кітай гатовы шляхам аб'яднаных намаганняў з міжнароднай супольнасцю працягваць яшчэ больш энергічна садзейнічаць міру і развіццю на Блізкім Усходзе», — сказаў ён.

Ван Вэньбінь падкрэсліў, што цяпер краіны Блізкага Усходу маюць патрэбу перш за ўсё ў сацыяльна-эканамічным росце і стабільнасці.

«Гаспадары Блізкага Усходу — народы, якія пражываюць на яго тэрыторыі», — сказаў на заканчэнне прадстаўнік МЗС Кітая.

ISSN 1990 - 763X
22138>
9 771990 763008

## КОРАТКА

• **Заўтра прафесіянальнае свята адзначаюць работнікі і ветэраны металургіі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванні ў адрас працаўнікоў галіны.**

• Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава наведала Верхнядзвінскі раён, дзе ўзяла ўдзел у пасяджэнні выканкама, пагутарыла з насельніцтвам па актуальных пытаннях і правяла выязную сустрэчу з дэпутатамі мясцовых Саветаў.

• **Міністэрства аховы здароўя: рост захваральнасці на COVID-19 чакаецца з верасня.**

• Авіяпералёты ў Еўропе да канца года могуць падаражэць на 21 працэнт.



Надзённае: аўтарынак

# Попыт падае, цэны растуць

**Для аўтамабільнага рынку гэты год аказаўся нетыповым. Як, дарэчы, і леташні. Пандэмія, якая заставалася з намі ў першым паўгоддзі, уносіла свае карэктывы, адбіваліся і парушаныя ланцужкі паставак камплектуючых для зборачных канвеераў у розных краінах, дэфіцыт электронных кампанентаў, да таго ж «паспрыялі» і ваенныя дзеянні ва Украіне...**

**Заканамерна, што датычыцца ўсё гэта не толькі новых аўто, але і «бэушных» — яны таксама падскочылі ў цане, іх кошт узрос на ўсіх рынках.**

**З якімі ж тэндэнцыямі сутыкнуліся вытворцы і аўтадылеры? Што ў рэшце рэшт чакае пакупнікоў да канца года? На гэтыя і іншыя пытанні паспрабаваў знайсці адказы карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 5



# НАПЯРЭДАДНІ ВАЖНАГА СТАРТУ...

**З 18 да 24 ліпеня** вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Для некаторых катэгорый абітурыентаў тэрміны падачы дакументаў іншыя. Так, **з 18 да 26 ліпеня** будуць прымаць дакументы ад тых, хто паступае на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю на дзённае аддзяленне (бюджэтную форму), у Ваенную акадэмію, Інстытут пагранічнай службы, а таксама на ваенныя факультэты (на бюджэт). А **з 15 лістапада да 5 снежня** — ад тых, хто паступае на завочную форму атрымання адукацыі ва ўстановы дадзенага профілю.

Усяго чатыры дні, **з 18 да 22 ліпеня,** адведзена на прыём дакументаў ад выпускнікоў профільных педагагічных, спартыўна-педагагічных і аграрных класаў, якія паступаюць без здачы экзаменаў па сумоўі на педагагічныя спецыяльнасці, напрамак «Фізічная культура і спорт» і спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:

**з 18 ліпеня да 3 жніўня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 18 ліпеня да 9 жніўня** — на дзённую форму атрымання адукацыі па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях (**з 15 лістапада да 5 снежня** — на завочную форму па дадзеным профілі);

**з 18 ліпеня да 8 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Унутраныя ўступныя іспыты ў ВНУ па асобных спецыяльнасцях (спартыўныя, творчыя, інтэграваныя) пройдуць **з 25 ліпеня да 2 жніўня.**

У Акадэміі МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, Ваеннай акадэміі, на ваенных факультэтах ВНУ ўнутраныя выпрабаванні пройдуць **з 25 да 27 ліпеня.** На ваенным факультэце Гродзенскага ўніверсітэта — **27—28 ліпеня. З 29 ліпеня да 4 жніўня** будуць здаваць экзамены абітурыенты, якія паступаюць на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці на дзённую форму і **з 6 да 15 снежня** — на завочную.



### НА ШТО АРЫЕНТАВАЦЦА?

Падаваць дакументы лепш у першыя дні, бо калі ахвотных цягнуць да апошняга акажацца шмат, то конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі, і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам. А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна. Апошняе абнаўленне інфармацыі ў дзень закрыцця прыёмных камісій адбудзецца ў 17 гадзін.

Тэрміны залічэння абітурыентаў на месцы, устаноўленыя кантрольнымі лічбамі прыёму для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту, наступныя: **да 29 ліпеня** — у Ваеннай акадэміі, Інстытуце пагранічнай службы, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС і на ваенных факультэтах ВНУ; **да 4 жніўня** — у іншых дзяржаўных ВНУ; **да 20 снежня** — на завочную форму атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю.

### ІЛЬГОТЫ І ПРЫВІЛЕІ

Кропкавыя змяненні, якія закранулі ўступную кампанію 2022 года, датычацца дастаткова вузкага кола абітурыентаў. Напрыклад, выпускнікі профільных спартыўна-педагагічных класаў могуць паступаць з бягучага года без уступных іспытаў пры належным узроўні паспяховасці на профільныя спецыяльнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту. Выпускнікі класаў ваенна-патрыятычнай накіраванасці змогуць паступаць ужо па крыху іншай ільгоце — гэта пазаконкурснае залічэнне на спецыяльнасці Ваеннай акадэміі, на ваенныя факультэты і ў Інстытут пагранічнай службы. У ВНУ Мінабароны змогуць пайсці тыя, хто вывучаў праграму факультатыву «Гатовы Радзіме служыць», у ВНУ Дзяржпагранкамітэта — факультатыву «Юны пагранічнік». Для абедзвюх катэгорый устаноўлена квота ў 30 працэнтаў ад лічбаў прыёму.

Без сертыфікатаў беларускага ЦТ змогуць паступаць і абітурыенты, якія здавалі Адзіны дзяржаўны экзамен у Расіі — у тым выпадку, калі яны паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, найбольш запатрабаваныя эканомікай. Пералік перыядычна карэкціруецца па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі, у яго ўваходзяць спецыяльнасці ў першую чаргу рэальнага сектара эканомікі: сельскай, лясной гаспадаркі, металургіі, лёгкай прамысловасці і іншыя. Прычым для такіх абітурыентаў устаноўлена квота ў 20 працэнтаў ад лічбаў прыёму.

Яшчэ адно змяненне закранула мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў. Калі раней яна распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер такі дагавор можа заключыць арганізацыя —заказчык кадраў, якая знаходзіцца ў любым населеным пункце Беларусі, у тым ліку ў сталіцы. Між іншым, магчымасць узяць мэтавае накіраванне ніяк не абмежавана месцам пражывання і прапіскі абітурыента. Так, абітурыент, які жыве ў Мінску, можа ўзяць мэтавае накіраванне ад арганізацый з Віцебскай ці Гродзенскай абласцей, і пасля заканчэння вучобы ён будзе размеркаваны менавіта туды.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце, напрыклад, план прыёму на мэтавыя месцы вырас удвая ў параўнанні з папярэднім годам.



— Прычым гаворка ідзе не толькі пра традыцыйныя для мэтавай падрыхтоўкі спецыяльнасці: журналістыка, мытная справа, педагагічныя... Цяпер мы гаворым і аб правазнаўстве, эканамічным праве, менеджменце з напрамкам «Менеджмент у міжнародным турызме», — расказаў **першы намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ.** — Гэта будзе мэтанакіраваная падрыхтоўка ў інтарэсах адпаведных ведамстваў.

### НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі ў БДУ стане аб'яднаны конкурс на групу спецыяльнасцяў. Ён будзе праводзіцца па двух профілях. Першы — «Матэматычныя навукі і інфарматыка»: гэта спецыяльнасці механіка-матэматычнага факультэта, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і Сумеснага інстытута БДУ і ДПУ — усяго 17 спецыяльнасцяў.

Другі профіль — «Фізічныя навукі»: спецыяльнасці фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, Сумеснага інстытута БДУ і ДПУ, а таксама Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ — усяго 11 спецыяльнасцяў.

У заяве, якая падаецца ў прыёмную камісію БДУ, абітурыент указвае першай прыярытэтную для яго спецыяльнасць, а затым расстаўляе па прыярытэтах усе астатнія, па якіх праводзіцца агульны конкурс. Абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе на першую ўказаную імі спецыяльнасць (напрамак спецыяльнасці), удзельнічаюць у конкурсе на наступныя спецыяльнасці (напрамкі спецыяльнасцяў) з названага імі прыярытэтнага пераліку.

Перад пасяджэннем прыёмнай камісіі па залічэнні праводзіцца размеркаванне абітурыентаў, якія прайшлі без экзаменаў, па-за конкурсам, а таксама прайшлі па конкурсе і набралі прахадны бал на факультэт (групу спецыяльнасцяў, групу напрамкаў спецыяльнасці). Размеркаванне абітурыентаў па спецыяльнасцях ажыццяўляецца адкрыта, у прысутнасці абітурыентаў і іх бацькоў (законных прадстаўнікоў). Зразумела, што аб'яднаны конкурс істотна павышае шанцы стаць студэнтам і не застацца за бортам прыёмнай кампаніі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Будзь у курсе!

**«Гарачая лінія» для абітурыентаў у Міністэрстве адукацыі 8 (017) 222-43-12.**

**Рабочая група Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах у Камітэце дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь у Мінску +375 (17) 327-66-80, e-mail: goskomisia@mail.ru**

# НАЙЛЕПШАЕ — АЙЧЫННАЕ

**Беларускія кампаніі сталі лаўрэатамі прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг.**

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання адбылася ў Ташкенце, дзе праходзіла пасяджэнне Міждзяржаўнага савета па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі краін СНД. Узнагароды былі ўручаны намеснікам старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Ільхомам Нёматавым.

Звання лаўрэата ўдастоены СТАА «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» (Ліда), ТАА «Праймілк» (Шчучын) і ААТ «Брэсцкі мясакамбінат». Дыпламантамі прызнаны ТАА «Вытворчае аб'яднанне «Энергакамплект» (Віцебск) і СААТ «Камунарка» (Мінск).

Прэмія СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг прысуджаецца адзін раз на два гады на конкурснай аснове арганізацыям дзяржаў — удзельніц Садружнасці за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці прадукцыі (паслуг), забеспячэнне яе бяспекі, а таксама ўкараненне высокаэфектыўных метадаў менеджменту якасці.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю БАМБІЗЫ Мікалая Мікалаевіча, былога кіраўніка дзяржаўных прыродаахоўных устаноў «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» (1994—1999) і «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» (2001—2011), і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Гандаль і фінансы

# Долю еўра пацясніў юань

**Як вядома, з 15 ліпеня кітайскі юань уключаны ў склад кошыка замежных валют, у якую раней уваходзілі толькі долар, еўра і расійскі рубель, прычым зроблена гэта за кошт памяншэння долі еўрапейскай валюты. Цяпер доля расійскага рубля ў кошыку роўная 50 %, долара — 30 %, а юаня і еўра — па 10 %. У Нацбанку падкрэслілі, што, прымаючы такое рашэнне, было ўлічана змяненне структуры знешнеэканамічных патокаў і аб'ёмаў таргоў валютамі на Беларускай валютна-фондавай біржы.**

Характэрна, што ўраўноўванне долей юаня і еўра відавочна зроблена з улікам меркаваных змяненняў у будучыні, бо пакуль аб'ёмы таргоў у еўра ў некалькі разоў перавышаюць аб'ёмы таргоў з юанямі. Як паведамлялі, у пачатку мая на Беларускай валютна-фондавай біржы, здзелкі з юанямі на біржы штодня здзяйснялі 23—25 удзельнікаў таргоў, сярод якіх было некалькі прадпрыемстваў, якія прадаюць валюту, што атрымліваецца ад экспарту тавараў у Кітай.

Як паведамляюць прадстаўнікі Цэнтра сусветнай эканомікі Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у студзені—маі 2022 года беларускі экспарт у КНР дасягнуў 500 мільёнаў долараў, што перавысіла экспарт за аналагічны перыяд мінулага года ў 1,5 раза.

За гэты час пастаўкі, напрыклад, ялавічыны павялічыліся ў 5,8 раза, мяса птушкі — у 2,6 раза, калійных угнаенняў — у 1,5 раза. У выніку доля Кітая ў беларускім экспарце вырасла з 2,3 % да 3,7 %. Пры гэтым, калі раней гандаль ажыццяўляўся па моры, то цяпер — па чыгунцы праз тэрыторыю Расіі.

Варта заўважыць, што доля Кітая ў знешнім гандлі нашай краіны ў цэлым павялічылася не так значна, як у экспарце: да 6,8 % з 6,4 %. Гэта азначае, што імпарт з Кітая расце не так хутка, як экспарт, хоць і застаецца большым, чым экспарт. Урад нашай дзяржавы разлічвае нарошчваць аб'ёмы паставак тавараў у Кітай, такім чынам кампенсуючы за кошт гэтага страту значнай часткі еўрапейскага рынку.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ООО «Марконстрой», 220035, г. Минск, ул. Москвина, д. 10, оф. 2** |

**Предмет электронного аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Начальная цена с НДС 20 %, долл. США* |
|---|---|---|
| **Помещение многоцелевого универсального назначения** (Помещение неустановленного назначения), инв. номер: 500/D-978818485, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-38 | 84,9 кв. м | **148 575,00** |
| **Помещение многоцелевого универсального назначения** (Помещение неустановленного назначения), инв. номер: 500/D-978818489, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-40 | 85,4 кв. м | **149 450,00** |
| **Помещение многоцелевого универсального назначения** (Помещение неустановленного назначения), инв. номер: 500/D-978818491, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-41 | 84,8 кв. м | **148 400,00** |
| **Помещение многоцелевого универсального назначения** (Помещение неустановленного назначения), инв. номер: 500/D-978818493, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-42 | 84,7 кв. м | **148 225,00** |
| **Помещение многоцелевого универсального назначения** (Помещение неустановленного назначения), инв. номер: 500/D-978818494, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-43 | 137,4 кв. м | **240 450,00** |
| **ФОК** (Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения), инв. номер 500/D-978818468, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-22 | 1905,2 кв. м | **1 600 000,00** |
| **Машино-место** (Машино-место) инв. номер: 500/D-798812665, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-119 | 17,6 кв. м | **17 000,00** |
| **Машино-место** (Машино-место) инв. номер: 500/D-798812668, по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 24-122 | 13,1 кв. м | **17 000,00** |

** Расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется по курсу НБРБ на дату платежа на расчетный счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **17.08.2022 г. с 10.00 до 12.00** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 15.08.2022 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 29-317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by; info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Продавец** | **ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61** |

**Предмет аукциона**

| Наименование, назначение | Начальная цена без НДС |
|---|---|
| **Квартира № 2а (число комнат – 3),** общей площадью 102,7 кв. м, инв. номер 110/D-2767185, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, б-р Бородинского, 4-2а. В состав лота входит охранная сигнализация (инв. номер 471210) | **135 726,50 бел. руб.** |

**Задаток в сумме 13 000,00** перечисляется на счет BY92BELB301200483500 80226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения (3 % от цены продажи предмета аукциона) за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.04.2022 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **03.08.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **01.08.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды изолированного помещения, инв. № 420/D-53781, площадью 119,1 кв. м (назначение – 4 02 04 Административно-торговое помещение, наименование – нежилое помещение), расположенного по адресу: Республика Беларусь, Гродненская обл., г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 1-2.
Срок договора аренды – 3 (три) года.
Размер ежемесячной арендной платы: 80,39 базовой арендной величины с учетом НДС.
Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – административные цели (офис); склад, торговый объект непродовольственной группы товаров (включительно одежда и обувь, бывшие в употреблении); оказание услуг населению (кроме ломбарда, ритуальных услуг и товаров).
Начальная цена продажи объекта – 503,20 руб. (пятьсот три рубля двадцать копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 50 руб. (пятьдесят рублей)

Продавец – УКП ТЦ «Потсдам», 231282, г. Лида, ул. Летная, 4, тел. 8-0154-645-778

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды;
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 августа 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 17 августа 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**



Статусбанк

**ОАО «СтатусБанк»**
www.stbank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2022 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2022 | 01.01.2022 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 7 101 | 5 735 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 12 499 | 3 891 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 52 119 | 21 708 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 33 050 | 54 792 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 2 434 | 2 210 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 642 | 1 135 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 107 845 | 89 471 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | 3 233 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 33 582 | 16 294 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 516 | 842 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 35 098 | 20 369 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 43 000 | 43 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 13 785 | 13 785 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 17 | 17 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 15 945 | 12 300 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 72 747 | 69 102 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 107 845 | 89 471 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2022 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2022 | 01.07.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 187 | 4 973 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 356 | 75 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 831 | 4 898 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 078 | 745 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 387 | 347 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 691 | 398 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 567 | 438 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 19 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (417) | (1 050) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 519 | 593 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 941 | 5 420 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 162 | 159 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 4 922 | 1 817 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 277 | 466 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 645 | 1 351 |

И. о. Председателя Правления Д.Е. Кожевников

Главный бухгалтер Е.М. Лаврович

Дата подписания: 11 июля 2022 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24 декабря 2021 года. УНП 807000043.*



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 420/С-37362 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание пункта технического обслуживания – 3), общей площадью 130,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В, корп. 1 с составными частями и принадлежностями (пристройка (Б1/к));
- капитальное строение, инв. № 420/С-39604 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин непродовольственных товаров), общей площадью 28,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В с составными частями и принадлежностями (Пристройка (Б1/к), покрытие (а), сооружение благоустройства (б), водопроводная сеть (в), тепловая сеть (трубопровод подающий, трубопровод обратный) (г), канализационная сеть (д), линия наружного освещения (е), резервуары РГС с технологическими трубопроводами (ж), линия связи (и)).
- оборудование: водомер СВХ-20; водогрейный котел на жидком топливе Vaillant VKO 27; бойлер Vaillant 120L; счетчики трехфазные (3 шт.); средства охранно-пожарной сигнализации (2 шт.); система охранной сигнализации; пожарная сигнализация; пожарно-питьевой водопровод наружный; мини-павильон 6*6.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000012 000056, площадью 0,7354 га (назначение – для обслуживания магазина непродовольственных товаров), находящемся по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В.
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Обременений со стороны третьих лиц нет

Начальная цена продажи – 534 984,00 руб. (пятьсот тридцать четыре тысячи девятьсот восемьдесят четыре рубля) с учетом НДС

Сумма задатка – 53 498 руб. (пятьдесят три тысячи четыреста девяносто восемь рублей)

Продавец – Открытое акционерное общество «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, тел. 8-0154-522-606

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 16 августа 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 12 августа 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

# «НАШ ДЭВІЗ... ЗНОЎ АКТУАЛЬНЫ ЯК НІКОЛІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Паверце, мы ў Беларусі гэта цэнім! Вялікі вам за гэта дзякуй. І сёння на гэтай сцэне я хачу падзякаваць усім, хто стаяў каля вытокаў стварэння фестывалю, хто ўсе гэтыя гады арганізоўвае свята, дорыць людзям сваю творчасць. Мы сапраўды разам стварылі маштабны праект сусветнага ўзроўню, які аб'ядноўвае народы і культуры, дэманструе наш агульны гістарычны выбар, нашу нацыянальную годнасць», — падкрэсліў беларускі лідар.

## НА ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ПЛЯЦОЎКАХ ВІЦЕБСКА БУДУЦЬ БЕЛАРУСЫ, РУСКІЯ, УКРАІНЦЫ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «Славянскі базар» ужо даўно выйшаў за рамкі культурнага мерапрыемства. І тое, што вакол яго пастаянна разгараюцца палітычныя страсці, яшчэ адно таму пацвярджэнне.

«Я ўдзячны ўсім удзельнікам фестывалю, хто смела і горда прыехаў прадставіць культуру сваёй краіны. У руках такіх, як вы, павінна быць будучыня свету. Свету, які, веру, пераадолее кінуты чалавецтву выклік на чалавечнасць! А на фестывальных пляцоўках Віцебска будуць выступаць беларусы, рускія, украінцы, прадстаўнікі многіх краін свету. Тут традыцыйна будуць гучаць разам імёны вялікіх расійскіх і іншых сусветных класікаў. Як павінна быць у сучасным высокаразвітым і цывілізаваным грамадстве», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт дадаў, што тут зноў будуць запальвацца новыя зоркі і маленькія зорачкі, а ў сэрцы кожнага артыста будзе жыць любоў да гэтай сцэны, да гэтага горада, да гэтых гледачоў, якія паверацъ у іх і падораць унікальны шанц, што адчыняе дзверы ў свет мастацтва.

Адкрыты Прэзідэнтам фестываль пачаўся з узнагароджання яго герояў. Заслужаную ўзнагароду з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў уладальнік Гран-пры XX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» — беларус Елісей Касіч. Таксама Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў уладальнікаў прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва — аўтарскі калектыў канцэртных праграм Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар», стваральнікаў Ржэўскага мемарыяла савецкаму салдату, аўтарскі калектыў выдавецкага праекта, прысвечанага 75-годдзю Перамогі народаў Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне «Гістарычная памяць Саюзнай дзяржавы». Кіраўнік краіны ўручыў спецыяльную ўзнагароду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» народнаму артысту Беларусі Анатолю Ярмоленку і заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь ансамблю «Сябры».

«Цудоўна, што ёсць такі фестываль, што ёсць такое свята на нашай зямлі. І што гэтая ўзнагарода называецца «Да міру і ўзаемаразумення». Тут, на нашай зямлі, заўсёды павінны быць мір і ўзаемаразуменне. У нас у краіне, за яе межамі, з нашымі суседзямі. Дзякуй. Вельмі добра, што вы ўвекавечылі гэты фестываль і гэтае свята тут, у Віцебску. І што ён цяпер наш. Ганарыцеся і даражыце гэтым, дарагія сябры», — сказаў са сцэны Анатоль Ярмоленка.

«Прыемна быць у гэтай зале. Я ж ужо немалады палітык. Адчуваю гэтую аўру, гэтую адкрытасць, гэтую шчырасць. Мяне ў гэтым плане не падманеш. Вы сапраўдныя. Дзякуй вам», — сказаў Прэзідэнт.

Як паведамляе Telegram-канал «Пул Першага», перад адкрыццём «Славянскага базару» Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю журналістам рыжскай дзіцячай Акадэміі радыё і тэлебачання. Перад тым як прыехаць у фестывальны Віцебск, маладыя журналісты напісалі ліст у прэс-службу кіраўніка дзяржавы з просьбай дапамагчы ў арганізацыі інтэрв'ю. «Упэўненыя, што ў дадзенай сітуацыі ў свеце, гэта будзе пазітыўнай падзеяй у грамадскіх адносінах», — гаворыцца ў лісце. А Прэзідэнта яны падлавілі проста перад сцэнай. «Наш Першы заўсёды за пазітыў! Інтэрв'ю, вядома, адбылося», — дадаюць аўтары Telegram-канала.

**Валерыя СЦЯЦКО,**

*г. Віцебск.*

«ПаБАЗАРым»

# 31 АДЦЕННЕ ФЕСТЫВАЛЮ

**Знакамітыя перазвоны «Славянскага базару» не змаўкаюць на вулачках культурнай сталіцы. Кожны з сямі дзён форуму мастацтваў напоўнены яркімі мерапрыемствамі і каларытнымі конкурсамі. Мы даведаліся, наколькі моцна б'ецца «сэрца» фестывалю ў гэтыя ліпеньскія дні.**





Фота БелТА.

## 30+1 ГОД НАТХНЕННЯ

14 ліпеня на сцэне Летняга амфітэатра адбылося ўрачыстае адкрыццё 31-га форуму мастацтваў, які даўно стаў візітнай карткай не толькі Віцебшчыны, але і ўсёй Беларусі. Павіншаваў гасцей, удзельнікаў і жыхароў Віцебска са святам творчасці і адзінства Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Ён уручыў Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу нашаму земляку Елісею Касічу, які па выніках двух конкурсных дзён атрымаў ад журы максімальны бал — 140. Гэта своеасаблівы рэкорд, бо члены журы ацэньвалі не столькі шоу, колькі вакальныя даныя юных зорачак.

Пастановай Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы прэміямі Саюзнай дзяржавы за 2021—2022 гады за творы літаратуры і мастацтва, якія ўносяць вялікі ўклад ва ўмацаванне брацкіх, дружалюбных адносін і ўсебаковае супрацоўніцтва паміж дзяржавамі — членамі Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, узнагароджаны аўтарскі калектыў канцэртных праграм Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»; аўтарскі калектыў Ржэўскага мемарыяла Савецкаму салдату; аўтарскі калектыў выдавецкага праекта, прысвечанага 75-годдзю Перамогі народаў Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне «Гістарычная памяць Саюзнай дзяржавы». Высокія ўзнагароды ўручыў Прэзідэнт Беларусі, як і спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» Анатолю Ярмоленку і ансамблю «Сябры». Іх імянная зорка на Алеі каля амфітэатра ўрачыста запалілася напярэдадні. «Цудоўна, што такая высокая ўзнагарода за мір і ўзаемаразуменне ўручаецца на нашай мірнай і незалежнай зямлі. Важна, каб гэтыя паняцці існавалі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Няхай так будзе заўсёды, ганарыцеся і шануйце гэта, паважаныя сябры!», — падзякаваў Анатоль Іванавіч.

Свае шчырыя віншаванні Віцебску даслаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, іх на сцэне зачытаў намеснік старшыні ўрада РФ Аляксей Аверчук.

На святочным канцэрце радавалі гледачоў зоркі айчыннай і замежнай эстрады: Дзяніс Майданаў, Ірына Дарафеева, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Вікторыя Алешка, Руслан Аляхно, Зара. Цудоўны нумар «Лібертанга» прадставілі Марыя Стэфана П'етрадаркі і Карэн Карапецян у суправаджэнні паветраных гімнастаў Белдзяржцырка. Даўні госць фестывалю Грыгорый Лепс выканаў свае знакамітыя хіты «Я паднімаю рукі», «Я шчаслівы» разам з залай. Завітаў на ўрачыстае адкрыццё і Сяргей Бязрукаў з пранікнёным вершам Канстанціна Сіманава «Чакай мяне». Прадстаўнікі сталага пакалення з радасцю сустракалі групу «Зямляне» з хітом «Трава ля дома» і яскравых Arabesque. Пераможца першага беларускага шоу «Х-фактар» Андрэй Панісаў выканаў з «Песнярамі» знакамітую «Волагду». Па традыцыі яркай вясёлкай салютаў заззяла над Віцебскам начное неба.

## ДЗВЕ СЯСТРЫ — БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ

Учора на фестывалі стартавалі Дні Саюзнай дзяржавы. Сёлета арганізатары пашырылі фармат — павялічылі колькасць саюзных Дзён і сумесных з рэгіёнамі Расіі праектаў — яны пройдуць на чатырох асноўных пляцоўках. Старт мерапрыемствам даў open-air на Пушкінскай плошчы «Гуляй, народ!», у канцэрце ў гістарычным цэнтры культурнай сталіцы ўзялі ўдзел Надзея Крыгіна і акадэмічны рускі народны ансамбль «Расія» імя Людмілы Зыкінай, народны ансамбль «Нясвіжскія лыжачнікі», ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы», тэатр песні і танца Смаленскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і іншыя.

У канферэнц-зале Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава ў трэці раз прайшоў круглы стол у фармаце дыскусійнай пляцоўкі па тэме: «Саюзная дзяржава — прастора для развіцця творчага патэнцыялу моладзі», у якой узялі ўдзел Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Пярцоў, міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, айчынныя і замежныя артысты, лаўрэаты прэміі Саюзнай дзяржавы.

«Культурны і духоўны падмурак, які на працягу стагоддзяў фарміравалі нашы народы, непарушны, — адзначыў у прывітальным слове **Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**. — Сёння весці дыялог з маладым пакаленнем мы павінны на роўных, запрашаць іх да ўдзелу ў культурна-асветніцкіх праграмах. Нягледзячы на тое, што ў кантэксце апошніх палітычных падзей маюцца спробы перайначыць гісторыю, умаліць подзвіг савецкага народа, прэзідэнты дзвюх краін не раз падкрэслівалі важнасць гістарычнай памяці. Мы павінны помніць пра мужнасць і гераізм савецкіх салдат, для якіх цана свабоды для мільёнаў была вышэйшая за цану свайго жыцця».

«Славянскі базар» сёлета загучаў па-новаму, інакш — улічваючы палітычную кан'юнктуру вакол нашых дзяржаў і тыя пагрозы, якія стаяць перад славянскім светам», — заўважыў **міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ**.

Паміж Беларуссю і Расіяй наладжана моцнае культурнае супрацоўніцтва. Напрыклад, на базе Вялікага тэатра Беларусі будуць арганізаваны сумесныя адукацыйныя мерапрыемствы, дзе тэатр стане своеасаблівым рэсурсна-метадычным цэнтрам для моладзі. Цяпер вядзецца работа па стварэнні ўнікальнага творчага аб'яднання — маладзёжнага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра. Абмеркаванне сумесных ініцыятыў будзе працягнута ў бягучым годзе ў Мінску на форуме, прысвечаным адзінай культурнай прасторы Беларусі і Расіі. Аб гэтым у відэазвароце расказала **міністр культуры Расійскай Федэрацыі Вольга ЛЮБІМАВА**.

«Мы актыўна працуем з Расіяй не толькі ў межах Саюзнай дзяржавы — паміж рэгіёнамі абедзвюх краін падпісана больш за 80 дагавораў у сферы культурна-адукацыйнага супрацоўніцтва. У чарговы раз восенню ў Магілёве пройдзе фестываль творчасці людзей з інваліднасцю «Разам мы зможам больш!» , у бягучым годзе ў Беларусі пройдуць Дні расійскай духоўнай культуры. Зараз вядзецца падрыхтоўка нашых дзіцячых творчых калектываў для ўдзелу ў Першым дзіцячым форуме ў Маскве», — расказаў **міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль МАРКЕВІЧ**.

Вечарам на сцэне амфітэатра прайшоў гала-канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае» з удзелам вядучых артыстаў і калектываў дзвюх краін. Дарылі добры настрой гледачам Алена Ланская, ансамбль «Песняры», «Хор Турэцкага», Дзіяна Гурцкая, Дзяржаўны ансамбль песні і танца Рэспублікі Татарстан, кубанскі казачы ансамбль «Крыніца» і іншыя.

## І ЛІЕЦЦА ПЕСНЯ

15 ліпеня ў Віцебскай абласной філармоніі адбыўся сольны канцэрт Дзідзюлі «Музыка свету», дзе музыкант выканаў любімыя кампазіцыі «Айседора», «Фламенка» і шэраг іншых. З праграмай «Казацкі край» у канцэртнай зале «Віцебск» выступіў Дзяржаўны казацкі ансамбль песні і танца «Стаўраполле», а вечарам зала напоўнілася гукамі джаза.

Сёня, 16 ліпеня, стартаваў XXXI Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2022», на якім нашу краіну прадстаўляе Ганна Трубяцкая. Наколькі паспяховым будзе выступленне нашай спявачкі і якія яшчэ мерапрыемствы пройдуць у горадзе на Дзвіне, чытайце ў наступным выпуску «ПаБАЗАРым».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

К@нтыненты

# СКОКІ СТАРОГА СВЕТУ

## Куды рушыць Еўропа?



**Днямі адбылася насамрэч знакавая падзея ў глабальных фінансах — курс еўра апусціўся ніжэй за долар, паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя таргоў. Гэта адбылося ўпершыню за амаль 20 гадоў (са снежня 2002-га). Перад гэтым курс еўра зраўнаваўся з курсам долара. Парытэт еўрапейскай і амерыканскай валют выклікаў занепакоенасць ва ўрадаў краін еўразоны і спажыўцоў, заўважыў Euronews. Гэта азначае павышэнне цэн на шэраг ключавых імпартных тавараў. Затое амерыканскія турысты, якія прыязджаюць на адпачынак у еўрапейскія краіны, актыўна здабываюць выгаду з сітуацыі, расходуючы долары ў мясцовых крамах і рэстаранах, канстатаваў Euronews. Большасць аналітыкаў сыходзіцца на думцы, што для эканомікі Старога Свету надышлі найцяжэйшыя часы. «Слабы еўра можа стаць штуршком да і без таго высокай інфляцыі, — перакананы прафесар эканомікі Гамбургскага ўніверсітэта Мікаэль Баўэр. — Не выключаны эфекты зваротнай сувязі. Гэта можа яшчэ пагоршыць сітуацыю». Куды ж рушыць Еўропа, дабрабыт якой зусім нядаўна здаваўся непахісным?**

### Стрэлілі ў галаву

Еўра цяпер на мінімальным узроўні за 20 гадоў, з таго часу як наяўную еўрапейскую валюту ўвялі ў абарачэнне. Цяпер у яе няма асаблівай падтрымкі, заявіла Reuters старшы эканаміст банка Standard Chartered Сара Х'юін. Прычыны падзення еўра — правал гандлёвага балансу Еўразоны, рэкордная інфляцыя, набліжэнне рэцэсіі, велізарныя даўгі шэрагу краін і «бяззубы» ЕЦБ, напісаў у Telegram-канале дырэктар «Газпрамбанк Private Banking» Ягор Сусін. Гэтыя фактары не абяцаюць еўра лёгкай будучыні, дадаў ён. Эксперт звярнуў увагу таксама на праблемы японскай ены, якая аказалася на мінімальным з 1998 года ўзроўні.

Стагніруючая эканоміка з рызыкай сыходу ў рэцэсію не можа валодаць моцнай валютай, напісаў эксперт BCS Express Міхаіл Зельцэр. Еўрасаюз сам абмяжоўвае экспарт і імпарт, парушае гандлёвы баланс, павялічвае яго дэфіцыт, а з адмоўным сальда гандлю казаць аб устойлівасці еўра не даводзіцца, дадаў ён. Зельцэр не выключыў зніжэнне курсу еўра ажно да 80 цэнтаў.

У Еўропе наступае сістэмны эканамічны крызіс, сігналам гэтага служыць парытэт еўра і долара, заявіў намеснік старшыні Савета бяспекі РФ Дзмітрый Мядзведзеў. «Спачатку еэсаўцы стрэлілі сабе ў галаву з санкцыйнага пісталета. Цяпер пажынаюць горкія плады спаду вытворчасці, закрытай прадуктовай інфляцыі, страты канкурэнтаздольнасці сваіх тавараў і чакання зімы ў ледзяным жыллі без нашага газу. Захоўвайце зберажэнні ў рублях!» — напісаў ён у Telegram. Па словах Дзмітрыя Мядзведзева, уводзячы санкцыі, Еўропа, у адрозненне ад ЗША і Вялікабрытаніі, не ўлічыла ўласныя «валютна-эканамічныя праблемы». «Санкцыі не працуюць. Санкцыі шкодныя самім еўрапейцам. Еўра слабее», — канстатаваў намеснік старшыні Савета бяспекі.

### Змрочныя перспектывы

Санкцыі, уведзеныя ЕС супраць Расіі, пагражаюць Еўропе сур'ёзнымі наступствамі. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на распаўсюджаны даклад Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). У ім адзначаецца, што ўзмацненне санкцый супраць Расіі і праблемы з пастаўкамі газу прывядуць шэраг еўрапейскіх краін да рэцэсіі, а таксама да далейшага павелічэння сусветных цэн на энерганосьбіты. Адзначаецца, што на фоне недахопу асноўных сыравінных тавараў энергетычны крызіс можа пагоршыцца харчовым. Абвастрыць існуючую сітуацыю могуць абмежаванні гандлёвых паставак, якія ўзмоцняцца з-за зніжэння даступнасці асноўных вытворчых рэсурсаў. У МВФ дадалі, што ключавымі фактарамі, якія ўплываюць на рост інфляцыі ў свеце, з'яўляюцца збоі ў ланцужках паставак, высокі попыт і ўстойлівы рост цэн на прадукты харчавання і энергарэсурсы. У прыватнасці, на фоне антырасійскіх санкцый захоўваецца рост кошту нафты.

Дырэктар-распарадчык МВФ Крысталіна Георгіева ў інтэрв'ю агенцтву Reuters заявіла, што ва ўмовах нестабільнай сітуацыі ў сусветнай эканоміцы нельга выключаць глабальнай рэцэсіі. Кіраўнік фінансавай установы адзначыла, што сітуацыя ў сусветнай эканоміцы моцна пагоршылася ў параўнанні з вясной гэтага года (у красавіку быў апублікаваны даклад на адпаведную тэму). Дырэктар фонду падкрэсліла: нягледзячы на тое, што бягучы год будзе цяжкі, наступны можа стаць яшчэ больш складаным. Паводле прагнозаў налета, рызыкі рэцэсіі павялічыліся.

Тым часам Еўрапейская камісія прадставіла новы прагноз росту цэн у краінах супольнасці на 2022 і 2023 гады. Згодна са справаздачай ЕК, прагноз па інфляцыі значна пагоршыўся, паведаміла РІА «Навіны». Яшчэ ўвесну Еўракамісія чакала, што сёлета сярэдні паказчык інфляцыі складзе 6,8 працэнта, а налета — 3,2 працэнта. Сённяшні прагноз сведчыць аб тым, што сітуацыя ў эканоміцы краін супольнасці пагаршаецца. Так, сёлета інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 8,3 працэнта, у 2023 годзе — 4,6 працэнта. Для параўнання: летась у ЕС гэты паказчык нават на фоне пандэміі каранавіруса і паўсюднага ўвядзення лакдаўнаў склаў 2,9 працэнта.

### Варажба на еўра

Цанавыя і рэйтынгавыя агенцтвы ў кампаніі незалежных экспертаў спаборнічаюць у прагнозах аб тым, чым пагражае Еўропе спыненне паставак энерганосьбітаў з Расіі. Напрыклад, аналітыкі Nomura International прадбачаць негатыўны прагноз для еўра ў сітуацыі, калі газаправод «Паўночны паток» не адновіць падачу газу ў ЕС пасля рамонтных работ. Гэта можа павярнуцца зніжэннем курсу еўра да 90 цэнтаў ужо ў найбліжэйшай перспектыве.

Bloomberg згодны з такім курсам еўра і дадае, што сітуацыя будзе падмацавана абвалам еўрапейскіх акцый на 20 працэнтаў. Спецыялісты UBS Group AG прыйшлі да высновы, што карпаратыўныя прыбыткі ў Еўропе ўпадуць больш чым на 15 працэнтаў, падзенне індэкса Stoxx Europe 600 перавысіць 20 працэнтаў, а курс еўра знізіцца да $0,90. Пры гэтым попыт на ахоўныя актывы верне даходнасць нямецкіх дзяржаблігацый да нулявой адзнакі.

Апасенні інвестараў заснаваныя на здагадках аб тым, што ЕЦБ наўрад ці зможа змякчыць уздзеянне негатыўных фактараў з-за неабходнасці павышаць стаўкі ва ўмовах рэкорднай інфляцыі. У BNP Paribas SA чакаюць, што ўплыў энергетычнага крызісу распаўсюдзіцца на акцыі аўтавытворцаў, а таксама прамысловых і хімічных кампаній.

І гэта доўгатэрміновыя трэнды — еўрапейскім краінам трэба рыхтавацца да таго, што кошт прыроднага газу будзе заставацца на высокім узроўні на працягу наступных двух гадоў. Пра гэта гаворыцца ў матэрыяле эканамічнага аглядальніка Bloomberg Хаўера Бласа, паведамляе ТАСС. Эксперт адзначае, што на рынку энергарэсурсаў кошт газу некалькі ніжэйшы за рэкордныя ўзроўні сёлетняга сакавіка. Прынамсі, пакуль. Аднак, зыходзячы з сітуацыі ў свеце, можна меркаваць, што высокія цэны будуць захоўвацца больш працяглы перыяд, чым прагназавалася яшчэ зімой.

Хаўер Блас заўважыў, што цяперашні крызіс з пастаўкамі блакітнага паліва ў краіны Еўрасаюза глыбейшы, чым выглядае на першы погляд. Па словах эксперта, тыя ж нямецкія ўлады апасаюцца, што Масква прыме рашэнне перакрыць газаправод «Паўночны паток» пасля завяршэння рамонтных работ на аб'екце. Тым не менш Хаўер Блас лічыць, што расійскі бок усё ж не спыніць прапампоўванне газу ў краіны ЕС.

### Дзіўныя «выпадковасці»

Еўрапейскія спажыўцы мацней за іншых адчуваюць на сабе інфляцыйныя і іншыя шокі, капітал бяжыць са Старога Свету, што і прыводзіць да аслаблення валюты. Адкуль жа кіруецца працэс? Многія назіральнікі ўпэўненыя, што аслабленне эканомікі ЕС і, магчыма, развал еўразоны — стратэгічная геапалітычная задача ЗША, перакананы expert.ru. Ёсць пэўныя фактары, якія гэта пацвярджаюць. Ключавая перавага Штатаў — долар, які з'яўляецца галоўнай рэзервовай валютай свету, у якой праводзіцца пераважная большасць міжнародных разлікаў. Наяўнасць такога магутнага інструмента дазваляе краіне пазычаць у вялізных аб'ёмах, заставацца фінансавым цэнтрам, аказваць геапалітычны ціск шляхам увядзення санкцый, адзначае expert.ru. Відавочна, ключавой задачай з'яўляецца захаванне статусу долара як дамінуючай валюты. Эксперты заўважылі, што як толькі агульны аб'ём разлікаў у свеце ў еўра набліжаецца да аб'ёму разлікаў у доларах, у Старым Свеце пачынаюцца крызісныя з'явы. Яны падахвочваюць капітал бегчы з рэгіёна, і асноўная альтэрнатыва — гэта, вядома, Амерыка.

У якасці прыкладу можна згадаць пазыковы крызіс еўразоны пачатку 2010-х гадоў, які, зноў жа, па ўскосных прыкметах адбыўся не без удзелу ЗША. Шмат у чым менавіта амерыканскія банкі ўчынілі пажар на рынку аблігацый краін перыферыйнай Еўропы, спачатку разладжваючы яго праз крэдытна-дэфолтныя свопы (CDS), а пасля і непасрэдна. Па «выпадковым» супадзенні, той еўрапейскі крызіс разгарнуўся тады, калі сусветныя разлікі ў еўра практычна зраўняліся з разлікамі ў доларах. А ў 2013-м еўра і зусім абышоў долар, пасля чаго былі вядомыя ўсім падзеі ва Украіне. Занадта шмат выпадковасцяў, каб не заўважыць пэўную заканамернасць. Краіна, якая валодае самай магутнай эканомікай і рэзервовай валютай, з'яўляецца сусветным дамінатарам. У Амерыцы сапраўды буйная і магутная эканоміка, аднак уся сістэма пабудавана на доларах.

Нельга не адзначыць Кітай, які з'яўляецца галоўным геапалітычным канкурэнтам Штатаў і па аб'ёме эканомікі ўжо даўно стаіць на роўных, аднак КНР пакуль не мае рэзервовай валюты. Зрэшты, афіцыйны Пекін актыўна працуе ў дадзеным напрамку. Доўгія гады МВФ адмаўляўся ўключаць юань у склад спецыяльных правоў запазычання (SDR), аднак некалькі гадоў таму ўсё ж не знайшлі аргументаў для адмовы. І Кітай ва ўласцівай яму манеры, без лішняга шуму, паступова праводзіць экспансію юаня на сусветную арэну. Вядома, пакуль доля разлікаў у кітайскай валюце не занадта вялікая, але і працэс гэты не хуткі, бо на коне стаіць вельмі шмат.

### На астравок свабоды

Калі чыноўнікі Еўрасаюза не прымуць адэкватных мер супраць інфляцыі з-за энергакрызісу, то ў еўрапейцаў застануцца два вырашэнні праблем — алкаголь і псіхатропныя рэчывы. Пра гэта канцлер Аўстрыі Карл Нехамер заявіў на рэгіянальным з'ездзе Аўстрыйскай народнай партыі (АНП). «Гэты рост цэн, гэтая інфляцыя, гэты абсурдна высокі ўзровень выдаткаў на энергію. І мы павінны прыняць меры такім чынам, каб не падганялі інфляцыю, а спрабавалі яе здушыць сумесна ў Еўрасаюзе», — заявіў Карл Нехамер, паведаміла РІА «Навіны». Ён лічыць, што ЕС тэрмінова патрэбныя адэкватныя меры супраць інфляцыі. Заява кіраўніка ўрада і кіруючай партыі выклікала ажыятаж у сацыяльных сетках.

Аднак далей за гучныя заявы наўрад ці справа пойдзе. Еўропа прымае ўсе рашэнні пад сцягам ЗША, заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» эстонскі палітолаг Дзмітрый Лінтэр. Паводле яго слоў, краіны Еўропы ва ўсіх сваіх рашэннях арыентуюцца на ЗША, якія, у сваю чаргу, з кожным днём узмацняюць кантроль над еўрапейскім рэгіёнам. «Гэта цывілізацыйны канфлікт. Канфлікт заключаецца ў тым, хто будзе вызначаць геапалітычнае становішча краін і магчымасць іх далейшага развіцця», — сказаў Дзмітрый Лінтэр. Па сутнасці, краіны Еўропы — адзін са штатаў ЗША, упэўнены палітолаг. «Еўрапейцы адэкватныя людзі, з імі можна весці камунікацыю. Еўрапейскія ўрады не самастойныя ў прыняцці рашэнняў. Таму яны будуць прытрымлівацца ў фарватары амерыканцаў, брытанцаў і рабіць тое, што яны ім скажуць. Гэта сістэмная работа, і яна не будзе спынена. І не таму, што яны не хочуць, а таму што яны несамастойныя». Усе еўрапейскія эліты — проста наёмныя менеджары, іх мяняюць як пальчаткі. Пра гэта заявіў у эфіры тэлеканала АНТ палітычны аглядальнік Аляксей Аўдонін: «Яны не дасягнулі выніку — іх спісалі».

А простыя еўрапейцы стаміліся ад нявырашаных праблем і жадаюць спакою, міру, стабільнасці. Таму яны прыязджаюць у Беларусь. Аб гэтым заявіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч, паведаміла БелТА. «Цяпер ідзе ашалелая прапаганда супраць Беларусі. І нават бязвізавы рэжым, які мы ўвялі, паглядзіце, як яны ашалелі. Што б яны ні рабілі, як бы сваіх грамадзян ні пераконвалі не ехаць у Беларусь — яны едуць», — адзначыў парламентарый. Паводле яго слоў, іншаземцы, якія да нас прыязджаюць, лічаць Беларусь астраўком свабоды. «Еўрапейцы хочуць спакою, міру, стабільнасці, каб сямейныя каштоўнасці былі ў пашане, — заўважыў дэпутат. — Таму яны хочуць сюды прыязджаць».

**Захар БУРАК.**

❍ Даслоўна

## «Мірнай і светлай будучыні ў нашым агульным доме — Еўропе»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні народу Францыі з нагоды нацыянальнага свята — Дня ўзяцця Бастыліі — вызначыў ключавыя прынцыпы супрацоўніцтва.

«Лозунг «Свабода. Роўнасць. Братэрства», сфармуляваны свабодалюбівым французскім народам у час барацьбы з абсалютызмам, сёння набывае новы сэнс у кантэксце міжнародных адносін. Магчымасць рабіць усё, што не шкодзіць іншым, раўнапраўе і адзінства стандартаў, стаўленне да навакольных так, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе, павінны быць галоўнымі прынцыпамі таксама і пры выбудоўванні дыялогу паміж краінамі», — адзначаецца ў віншаванні, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што існуючыя дружалюбныя сувязі паміж людзьмі стануць вызначальным фактарам у развіцці супрацоўніцтва, зробяць яго непадуладным ні часу, ні палітычнай кан'юнктуры.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Выигрывай с Onliner 24»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «ТрайдексБелПлюс», юридический адрес: 223016, Минская область, Минский район, с/с Новодворский, д. 33, корпус 1, пом. 8-9 (район д. Большое Стиклево), зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191623092, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским райисполкомом от 13.01.2012.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 06.06.2022 по 08.08.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4194, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 18.05.2022.

5. Количество участников рекламной игры – 755 чел.

6. Информация о призовом фонде: размер призового фонда рекламной игры составляет 5376 (пять тысяч триста семьдесят шесть) белорусских рублей 75 (семьдесят пять) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз 1 | Напольные весы Haylou CM01 Dark green | 7 | 39,52 | 276,64 | без НДС | – | 276,64 |
| | | 3 | 39,51 | 118,53 | без НДС | – | 118,53 |
| | Напольные весы Haylou CM01 Light white | 7 | 39,52 | 276,64 | без НДС | – | 276,64 |
| | | 3 | 39,51 | 118,53 | без НДС | – | 118,53 |
| Приз 2 | Беспроводные наушники Haylou GT1 PRO | 17 | 21,82 | 370,94 | без НДС | – | 370,94 |
| | | 3 | 21,81 | 65,43 | без НДС | – | 65,43 |
| Приз 3 | Беспроводные наушники Haylou GT3 | 19 | 28,01 | 532,19 | без НДС | – | 532,19 |
| | | 1 | 28,00 | 28,00 | без НДС | – | 28,00 |
| Приз 4 | Беспроводные наушники Haylou GT5 | 18 | 36,37 | 654,66 | без НДС | – | 654,66 |
| | | 2 | 36,36 | 72,72 | без НДС | – | 72,72 |
| Приз 5 | Беспроводные наушники Haylou GT6 Black | 8 | 27,65 | 221,20 | без НДС | – | 221,20 |
| | | 7 | 27,64 | 193,48 | без НДС | – | 193,48 |
| | Беспроводные наушники Haylou GT6 White | 15 | 27,94 | 419,10 | без НДС | – | 419,10 |
| Приз 6 | Беспроводные наушники Haylou GT7 Transparent black | 5 | 29,47 | 147,35 | без НДС | – | 147,35 |
| | | 5 | 29,46 | 147,30 | без НДС | – | 147,30 |
| | Беспроводные наушники Haylou GT7 White | 3 | 29,02 | 87,06 | без НДС | – | 87,06 |
| | | 1 | 29,01 | 29,01 | без НДС | – | 29,01 |
| | | 5 | 29,53 | 147,65 | без НДС | – | 147,65 |
| | | 1 | 29,52 | 29,52 | без НДС | – | 29,52 |
| Приз 7 | Беспроводные наушники Haylou W1 Blue | 10 | 53,43 | 534,30 | без НДС | – | 534,30 |
| | Беспроводные наушники Haylou W1 White | 7 | 53,88 | 377,16 | без НДС | – | 377,16 |
| | | 3 | 53,89 | 161,67 | без НДС | – | 161,67 |
| Приз 8 | Умные часы Haylou LS02 | 7 | 36,77 | 257,39 | без НДС | – | 257,39 |
| | | 3 | 36,76 | 110,28 | без НДС | – | 110,28 |
| **Итого:** | | | | | | | **5376,75** |

7. Фамилии победителей рекламной игры с указанием их выигрышей опубликованы в глобальной компьютерной сети Интернет на сайте Организатора: https://content.onliner.by/catalog/Победители_отзывы.pdf.

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 08.08.2022 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества КСУП «Птицефабрика «Новая заря»

| Лот | Наименование | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN | Лот | Наименование | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение с инв. № 633/С-1000382, назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – ФАП (Фельдшерско-акушерский пункт), площадью 91,4 кв. м | 6 318,00 | 631,80 | 315,90 | 14 | Весы | 0,59 | 0,06 | 0,03 |
| 2 | Комплекс недвижимого и движимого имущества для разведения сельскохозяйственной птицы согласно списку https://drive.google.com/file/d/1J4h_Di9-wVDBAqc6LRFeR74lBtc-61rY/view?usp=sharing | 123 835,45 | 12 383,55 | 6 191,77 | 15 | Факс «Панасоник» kx-ft988 | 1,06 | 0,11 | 0,05 |
| 3 | Оборудование холодильное (32.7 дм. куб.) | 33,60 | 3,36 | 1,68 | 16 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 4 | Очиститель высокого давления (моечная машина) | 2,28 | 0,23 | 0,11 | 17 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 5 | Принтер маркировочн. «ЭКСТ-Челнок» | 31,20 | 3,12 | 1,56 | 18 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 6 | Агрегат для штамп. яйца «ЭКСТ-Челнок» | 31,20 | 3,12 | 1,56 | 19 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 7 | Короба, 320 шт. | 8,45 | 0,84 | 0,42 | 20 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 8 | Прокладки, 3500 шт. | 21,00 | 2,10 | 1,05 | 21 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 9 | Бачок для унитаза | 0,02 | 0,01 | 0,01 | 22 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 10 | Стул | 0,52 | 0,05 | 0,03 | 23 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 11 | Весы электронные | 0,29 | 0,03 | 0,01 | 24 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 12 | Термометр | 0,60 | 0,06 | 0,03 | 25 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |
| 13 | Термометр | 0,60 | 0,06 | 0,03 | 26 | Кресло | 0,20 | 0,02 | 0,01 |

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 624050100001002005 площадью 0,1047 га, назначение – земельный участок для строительства и обслуживания ФАПа. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код 5,2, площадь 0,0254 га.
Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым № 624082000001000005 площадью 13,4905 га, назначение – земельный участок для ведения товарного сельского хозяйства – обслуживания зданий и сооружений птицефабрики. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код 6, площадь 0,2089 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код 6, площадь 0,2192 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код 6, площадь 0,6282 га

В отношении Лота № 1 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость лота снижена на 35 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Нарачанская зара» от 01.07.2022, от 11.06.2022, от 30.04.2022. В отношении Лотов №№ 2–26 проводятся одиннадцатые повторные торги. **Стоимость Лота № 2 снижена на 87 %; стоимость Лотов №№ 3–26 – на 99 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Нарачанская зара» от 01.07.2022, от 11.06.2022, от 21.05.2022, от 30.04.2022, от 13.04.2022, от 23.03.2022, от 02.03.2022, от 02.02.2022, от 12.01.2022, от 11.12.2021, от 23.10.2021

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **28 июля 2022 года в 14.30 (регистрация – с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 18 июля 2022 года до 15.00 27 июля 2022 года |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, западнее деревни Выголовичи |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA3012221 5570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, КСУП «Птицефабрика «Новая заря», проводимых 28.07.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Нарачанская зара») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов (по лотам №№ 1, 3–26); 5 % от конечной цены предмета торгов (по лоту № 2).** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Чеславу (+375296997988).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляются Покупателем самостоятельно и за свой счет. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **Коммунальное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Птицефабрика «Новая заря» (222404, Минская область, Мядельский район, с/с Княгининский, д. Выголовичи, ул. Зеленая, д. 40) ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293489225, +375295767715** |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Снежинка»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость без НДС, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание бытовых услуг) с инв. № 630/С-78812 общей площадью 991 кв. м, вентилятор ВКР 8 427, вентиляция 335, трансформаторная подстанция 005, счетчик холодной воды турбинный | 280 000,00 | 28 000,00 | 14 000,00 |

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером **642000000003000053** общей площадью **0,6734 га** для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования

В отношении лота 1 проводятся вторые повторные торги после оценки. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 94 (29716) от 17.05.2022, стр. 7, № 128 (29750) от 02.07.2022, стр. 2

В отношении лота № 1 имеется обременение в виде ипотеки, правообладатель – ОАО «Банк БелВЭБ». По вопросам обременения обращаться по тел. +375293432510, Максим Александрович

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **3 августа 2022 года в 14.30 (регистрация – с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 18.07.2022 до 16.00 01.08.2022** |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 23А |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA301222155700 40270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту ___, ЗАО «Снежинка», проводимых __.__.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица), принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Сергею Ивановичу (+375336477307).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ЗАО «Снежинка», УНП 600029449 (222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 23А) в лице директора Анопа Сергея Ивановича, тел. +375336477307** |

# Попыт падае, цэны растуць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Дык вось, у маі 2022 года адносна красавіка рынак новых аўтамабіляў скараціўся яшчэ на 30 %, а ў параўнанні з аналагічным перыядам 2021 года — ажно на 83 %. Было прададзена 629 адзінак чатырохколавага транспарту. А за студзень—май 2022 года ў краіне прададзена ўсяго 10606 аўтамабіляў. У параўнанні з аналагічным перыядам 2021 года — 41 %. Такі вынік звязаны з істотным змяненнем цэн на большасць папулярных мадэляў, а таксама пагаршэннем умоў крэдытавання.

Трэба сказаць, што ў апошнія гады больш за 70 % продажаў на беларускім аўтарынку прыпадала на аўтамабілі, вырабленыя ў Расіі. Пачынаючы з сакавіка, вытворцы павышалі адгрузачныя цэны ад 40 да 70 %. Пазней адбылося ўмацаванне курсу расійскага рубля, што таксама паўплывала на фарміраванне прайс-лістоў і прывяло да сумарнага павелічэння цэнаў для беларускіх дылераў да 95 %.

Такія тэндэнцыі, дарэчы, характэрныя не толькі для нашай краіны, але і для аўтамабільных рынкаў Расіі і Казахстана. Больш за тое — ёсць усе перадумовы лічыць, што сітуацыя ў хуткім часе істотна не зменіцца. Улічваючы тое, што большасць аўтамабільных заводаў у Расіі спыніла вытворчасць, пакупнікі ў Беларусі ўжо ў найбліжэйшыя месяцы могуць сутыкнуцца з дэфіцытам аўтамабіляў.

Усе аўтамабільныя дылеры цяпер знаходзяцца ў няпростым становішчы. У сітуацыі, якая склалася, адзінай крыніцай даходу для іх застаецца аўтасэрвіс, які дазволіць трымацца на плаве. Пры гэтым дылеры будуць рабіць усё магчымае, каб ён заставаўся ўсё ж даступным для кліента. Інакш за справу возьмуцца майстры-самавучкі ў сваіх гаражах.

Дылеры ж у гэтых умовах імкнуцца захаваць супрацоўнікаў, а рынак сёння склалася. З аднаго боку, гэта няўпэўненасць і жаданне адкласці пакупкі да больш стабільных часоў.

З іншага боку, чалавек, які доўга збераґаў грошы на куплю аўто ў доларах, атрымліваючы пакрысе дэпазітныя стаўкі ў памеры 5 % гадавых, сутыкаецца з тым, што жаданы аўтамабіль падаражэў на 50 % у доларавым эквіваленце, і гэта адварочвае ад неадкладнага здзяйснення пакупкі.

Па словах эксперта, пакуль яшчэ аўтамабільны рынак Беларусі з'яўляецца рынкам пакупнікоў, але не выключана, што ў перспектыве некалькіх месяцаў ён ператворыцца ў рынак прадаўцоў.

Варывода таксама адзначае, што на гэты момант у многіх аўтадылераў Беларусі захоўваюцца дастатковыя складскія запасы машын.

І нават спыненне паставак па шэрагу марак пакуль не мяняе суадносін — прапанова, якая ўключае ў сябе адзінкавыя асобнікі некаторых еўрапейскіх марак і сотні машын карэйскіх, кітайскіх і расійскіх аўтавытворцаў, апярэджвае патэнцыяльны попыт. Але такая сітуацыя, на яго думку, будзе доўжыцца нядоўга.

— Напрыклад, даступнасць такой папулярнай у Беларусі маркі, як Lada, пакуль не выклікае асцярогі на ўсё лета. Ёсць прапановы ў Volkswagen у розных колеравых рашэннях. Заўважце, нават дылер Volkswagen сёння мае дастатковую колькасць машын для таго, каб праводзіць акцыі і распродажы. Так што пакуль дамінуе прапанова, і яна перавышае попыт.

Аднак гэта толькі карціна на дадзены момант, на сёння. Перспектывы папаўнення складоў аўтадылераў, якія паволі ўсё ж будуць вызваляцца, невідавочныя. І сітуацыя па розных марках будзе адрозніваецца. Магчымы дэфіцыт прывядзе да росту цэн.

Прапанова будзе скарачацца, а попыт будзе стагніраваць з перспектывай вельмі павольнага аднаўлення: хутчэй за ўсё, пачынаючы з 4 квартала 2022 года.

Гаворачы аб расійскім аўтапраме, Сяргей Варывода прыводзіць як прыклад перапрацоўчую галіну РФ, дзе істотнае падзенне запасаў апярэджвае магчымасць новай вытворчасці.

### Тым часам

**Паводле звестак Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, у Беларусі ў чэрвені гэтага года было прададзена 1113 новых аўтамабіляў (рост у 2,4 раза да мая бягучага года). Аднак у гадавым выражэнні гэта складае толькі трэцюю частку ад продажаў чэрвеня 2021 года.**

**Як раней паведамлялася, у другім паўгоддзі «ціснуць» на ўзровень цэн на аўто ў Беларусі можа дэфіцыт новых легкавых аўтамабіляў, лічаць у БАА.**

Калі коратка падсумаваць вышэйсказанае, то можна адзначыць: сёння на аўтамабільным рынку Беларусі склалася неадназначная сітуацыя: умацаванне расійскага рубля, рэзкі скачок цэн, скарачэнне выбару марак аўтамабіляў, павышэнне ставак крэдытавання і... туманныя перспектывы ў найбліжэйшай будучыні. Негатыўныя наступствы адчуваюць на сабе і аўтадылеры, і пакупнікі. Мы пагутарылі з экспертамі і даведаліся, што чакае айчынны аўтарынак і якія маркі аўто цяпер даступныя для пакупнікоў.

## ЧАМУ ПОПЫТ ПАДАЕ, А ЦЭНЫ РАСТУЦЬ?

**Член праўлення Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі (БАА) Сяргей ВАРЫВОДА** адзначае, што вельмі хуткае падзенне продажаў на айчынным аўтамабільным рынку адбылося на фоне цанавых змяненняў, якія спажыўцы адразу ж адчулі.

Ён адзначае яшчэ тры фактары, што паўплывалі на падзенне попыту: высокія працэнтныя стаўкі па крэдытах, узровень даходаў насельніцтва (людзі сталі больш эканомна траціць грошы) і наогул — агульная матывацыя людзей.

— Даступнасць спажывецкіх крэдытных і лізінгавых прадуктаў, якая вымяраецца ў тым ліку паказчыкам пазыковай нагрузкі і іншымі параметрамі, на гэты момант вельмі зніжана. Пры гэтым працэнтныя стаўкі высокія, а прапаноў, з якіх можна было б выбіраць, няшмат.

Узровень жа даходаў большасці патэнцыяльных крэдытаатрымальнікаў не дазваляе прыцягваць вялікія крэдыты (на 50-60 тысяч рублёў) альбо браць аўто ў фінансавы лізінг на такіх умовах і па цэнах, прапанаваных рынкам, бо даходы насельніцтва не істотна выраслі за апошнія некалькі месяцаў.

Заўважу, што пры існуючай інфляцыі і высокіх працэнтных стаўках у перспектыве некалькіх гадоў кошт «сярэдняга» (эконом-клас) аўтамабіля можа павялічыцца ўдвая.

**Генеральны дырэктар кампаніі «Актыўлізінг» Сяргей МІХНЕВІЧ, у мінулым старшыня праўлення БАА,** адзначае, што ў сярэднім лізінгавыя плацяжы сёння выраслі на 30-50 % у адносінах да тых, якія былі яшчэ паўгода таму.

— Ёсць спецыяльныя сумесныя праграмы з аўтадылерамі, якія дазваляюць знізіць стаўку па лізінгавым плацяжы праз кампенсацыю. Ёсць таксама варыянты растэрміноўкі па некаторых брэндах, калі кліенту не даводзіцца пераплачваць. Аднак такія прапановы вельмі абмежаваныя. Самая выгадная лізінгавая прапанова сёння існуе на аўтамабілі ГАЗ, у беларускіх рублях.

У асноўным аўтадылеры не ідуць на стварэнне спецыяльных лізінгавых праграм з прычыны складанай сітуацыі на рынку. Тыя, хто прадае ў лізінг, прадаюць на ўмовах па стаўцы 26 % гадавых у беларускіх рублях і 12-15 % гадавых у доларах. У чэрвені 2022-га стаўкі сталі зніжацца, але ў красавіку і маі яны былі на піку.

## VOLKSWAGEN, KIA, LADA... ЯКІЯ ЯШЧЭ АЎТО ДАСТУПНЫЯ СЁННЯ?

Сяргей Варывода адзначае вялікую ролю псіхалагічнага фактару ў сітуацыі, якая склалася.

**«Сёння на аўтамабільным рынку Беларусі склалася неадназначная сітуацыя: умацаванне расійскага рубля, рэзкі скачок цэн, скарачэнне выбару марак аўтамабіляў, павышэнне ставак крэдытавання і... туманныя перспектывы ў найбліжэйшай будучыні. Негатыўныя наступствы адчуваюць на сабе і аўтадылеры, і пакупнікі».**

Ён адзначае, што ніхто не ведае дакладна, якая колькасць запасаў камплектуючых засталася на складах расійскіх аўтавытворцаў, каб сабраць аўто нават спрошчанай камплектацыі. Аднак, паводле яго слоў, запасы чыпаў, мікрасхем, якія выкарыстоўваюцца ў большасці блокаў сучаснага аўтамабіля, паволі зніжаюцца.

**Аўтаэксперт Андрэй ПРАВАТОРАЎ** адзначае, што на гэты момант у Беларусі даступныя да куплі Geely, Haval, Chery, VW, KIA, Mazda, Mitsubishi, Renault, Nissan, Lada, Hyundai, Audi.

— Кошты выраслі, але аўтамабілі ў наяўнасці яшчэ ёсць. Больш за ўсё перспектыў — у кітайскіх брэндаў: па наяўнасці аўтамабіляў на складах, цэнах, наяўнасці фінансавых праграм для іх рэалізацыі.

## АЎТО ПРАЦЯГНУЦЬ ДАРАЖЭЦЬ?

Сяргей Варывода адзначае, што сітуацыя можа ўскладніцца, і многае будзе залежаць ад далейшага курсу расійскага рубля. На яго думку, жадаючым купіць новы аўтамабіль больш выгадна зрабіць гэта цяпер.

### ❍ Між іншым

**Продажы аўтамабіляў у Еўрапейскім саюзе ўпалі на 14 % у першай палове 2022 года ў параўнанні з тым жа перыядам 2021 года, паведаміла ў пятніцу Еўрапейская асацыяцыя вытворцаў (ACEA).**

**У разрэзе еўрапейскіх рэгіёнаў сітуацыя выглядае так: Італія (-22,7 %), Францыя (-16,3 %), Германія (-11 %) і Іспанія (-10,7 %). Рынак Вялікабрытаніі ўпаў на 11, 9 % за той жа перыяд. Такім чынам, чэрвень стаў 11-м месяцам спаду запар: продажы ў ЕС за год упалі на 15,4 %.**

— Мы працуем з дзвюма кітайскімі маркамі з трох прысутных на рынку — гэта Haval і Chery, якія імпартуюцца на тэрыторыю РФ і затым паступаюць у Беларусь. Пакуль мы не бачым абмежаванняў на чысты імпарт аўто.

Па марцы Chery перспектывы паставак на рынак бясхмарныя — аўто будуць і праз паўгода, і праз год. Haval жа выпрацоўваецца на заводзе ў Расіі пад Тулай. Я не змагу даць прагноз на год, але да канца 2022 года выраблены аўтамабіляў больш чым дастаткова для забеспячэння бягучага ўзроўню попыту. Таксама ёсць пытанне цаны — мы не ведаем, які кошт у аўто будзе заўтра.

**«Ёсць спецыяльныя сумесныя праграмы з аўтадылерамі, якія дазваляюць знізіць стаўку па лізінгавым плацяжы праз кампенсацыю. Ёсць таксама варыянты растэрміноўкі па некаторых брэндах, калі кліенту не даводзіцца пераплачваць. Аднак такія прапановы вельмі абмежаваныя. Самая выгадная лізінгавая прапанова сёння існуе на аўтамабілі ГАЗ, у беларускіх рублях».**

У тых аўтадылераў, якія імпартуюць аўтамабілі з-за граніц Мытнага саюза, напрыклад, Audi, нічога не памянялася, за выключэннем, можа быць, больш складанай лагістыкі. І цэны знаходзяцца на вельмі канкурэнтным узроўні. Аднак такіх дылераў на пачатак 2022 года было каля 5 %, а больш за 80 % аўто пастаўляецца з РФ. І тут мы маем кумулятыўны эфект двух магутных фактараў: рэзкае павышэнне цэн у расійскіх рублях — мы фактычна імпартуем у Беларусь інфляцыю ў аўтамабільнай галіне з Расіі, і рэзкае ўмацаванне расійскага рубля да беларускага — на 30 %, якое і лягло ў цану.

Сёння ў большасці дылерскіх салонаў цэны сфарміраваны яшчэ па курсах сакавіка-красавіка 2022 года. Калі рана ці позна расійскі рубель не пачне слабець да беларускага, то аўто, што ўвозяцца з РФ, будуць працягваць даражэць.

Таму тым, хто хоча купіць аўтамабіль сёлета, я параіў бы купляць з рэшткаў, паколькі ў іх закладзены курс менш як 4 беларускія рублі за 100 расійскіх. А далей дылерам прыйдзецца набываць валюту і завозіць аўтамабілі ўжо як мінімум па 4,5 рубля.

## АЎТО З ЕЎРОПЫ: ДЛЯ ТЫХ, ХТО НЕ ЦЕРПІЦЬ АЛЬТЭРНАТЫЎ

Сяргей Міхневіч лічыць, што сёння, дзякуючы зняццю постковідных абмежаванняў і адкрыццю граніц, можна купіць новае аўто ў Літве і іншых еўрапейскіх краінах.

— Новы аўтамабіль можна прывезці з-за мяжы. Межы цяпер паволі адкрываюцца, постковідныя абмежаванні зніжаюцца. На фоне аслаблення еўра да долара еўрапейскія аўто сталі больш канкурэнтаздольныя, плюс існуюць наладжаныя каналы паставак.

Больш за тое, у Еўропе ўжо адкрываюцца аўтазборачныя вытворчасці. На фоне гэтага, думаю, цэны на аўто з прабегам таксама пачнуць зніжацца і стануць яшчэ больш прывабнымі для ўвозу ў Беларусь, бо ў Еўропе будзе забяспечаны значны прыток новых машын.

Эксперт звярнуў увагу на тое, што сёння мы бачым вяртанне цікавасці да аўто з прабегам. Паводле яго слоў, яны больш даступныя і прапануюцца па лізінгавых і крэдытных праграмах.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

## Тэорыя і практыка маёй рэктарскай работы




Як першы прарэктар, я курыраваў вучэбны працэс, але Міхаіл Іванавіч Вішнеўскі папрасіў мяне пакінуць за ім кіраўніцтва арганізацыяй навуковых даследаванняў, чым ён пры рэктару Аўласевічу і займаўся. Я быў не супраць, але тады патрэбен быў прарэктар па вучэбнай рабоце, і вось над кандыдатурай я задумаўся. Разумеў, што на гэтую пасаду трэба прызначаць некага з дэканаў. Яны ўсе — разумныя, аўтарытэтныя і як вучоныя, і як выкладчыкі, і як арганізатары вучэбнага працэсу. Яны ўсе мае сябры, лічы, са студэнцкіх гадоў. Сярод іх нават два мае аднакурснікі! Але гэта быў 2001-ы, год прэзідэнцкіх выбараў. Не магу сказаць, што ў нашым універсітэце была заўзятая апазіцыя, але нязгодныя з палітыкай дзеючага Прэзідэнта ўсё ж былі. Ды і адчувалася яшчэ водгулле актыўнасці БНФ, настойлівай беларусізацыі, ужо радзей, але яшчэ дзе-нідзе гучалі нацыяналістычныя лозунгі. Прэзідэнт краіны — наш выпускнік, і было б няправільна ва ўніверсітэце патураць яго праціўнікам. А яны былі больш прыкметныя на філалагічным факультэце. І я вырашыў прапанаваць пасаду прарэктара па вучэбнай рабоце дэкану згаданага факультэта Мікалаю Пятровічу Бузуку. Ён доўгі час да гэтага працаваў намеснікам дэкана педагагічнага факультэта, славіўся строгім і патрабавальным кіраўніком, вучэбны працэс ва ўніверсітэце ведаў дасканала і, што і вызначыла канчатковае маё рашэнне, кандыдацкую дысертацыю пісаў па тэматыцы развіцця беларускай мовы. А сярод выкладчыкаў гэтага профілю і было больш за ўсё сумятні. Палітычную работу сярод сваіх калег я і залічыў у абавязак прарэктару Бузуку. Ён з усім справіўся, працаваў на пасадзе прарэктара амаль дваццаць гадоў, і прыкметных палітычных пратэстаў у нас не здаралася.

Я заўсёды адкрыта сцвярджаў, што рэктар універсітэта можа адбыцца толькі ў тым выпадку, калі яго прызнаюць сваім кіраўніком дэканы. Прарэктары ўжо цалкам адміністратары, у іх няма непасрэднага кантакту не толькі са студэнтамі, але нават з выкладчыкамі. Загадчыкі кафедраў у маштабе ўніверсітэта не вельмі ўплывовыя. А вось дэканы! У іх ёсць прыкметны адміністрацыйны рэсурс: прымаюць на работу выкладчыкаў, дазваляюць пераздачы экзаменаў, размяркоўваюць стыпендыю, месцы ў інтэрнаце і шмат іншага. Іх ведаюць не толькі ўсе выкладчыкі і студэнты, іх добра ведаюць у горадзе і вобласці, у тым ліку і рэгіянальнае кіраўніцтва. Яны прафесійныя, як універсітэцкія выкладчыкі, і, аб'яднаўшыся, здольныя скласці і шырока агучыць негатыўнае меркаванне пра рэктара, змяніць якое будзе вельмі цяжка. Таму менавіта праз дэканаў варта ажыццяўляць усе стратэгічныя і тактычныя планы развіцця ўніверсітэта. У мяне была дастойная каманда дэканаў!

Прафесар Пётр Фраловіч Дзмітрачкоў — дэкан гістарычнага факультэта. На гэтай пасадзе ён прапрацаваў больш за трыццаць гадоў. Вядомы і вельмі аўтарытэтны вучоны-гісторык, аўтар многіх вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, узор дэкана факультэта. Яго крылатая фраза: «Няма дрэнных студэнтаў! Ёсць добрыя і не вельмі...»

Аляксей Сцяпанавіч Лаўшук узначаліў філалагічны факультэт пасля прызначэння дацэнта Бузука прарэктарам па вучэбнай рабоце. Лаўшук як вучоны-лінгвіст вывучаў развіццё сучаснай беларускай мовы. У пачатку дзевяностых, пры настойлівай беларусізацыі вучэбнага працэсу, вёў для выкладчыкаў семінар па праблемах тэрміналогіі, і мы з задавальненнем пад яго патранажам вярталі сваё веданне роднай мовы. Жывы, камунікабельны, заўсёды з іскрынкай у вачах, ён адразу стаў у інстытуце вядомай асобай, калі пасля абароны дысертацыі даслаў жонцы тэлеграму з адным словам: «Абараніўся!»

Рэктарам інстытута павышэння кваліфікацыі працаваў Канстанцін Міхайлавіч Бандарэнка. Мы з ім сябравалі яшчэ са студэнцкіх гадоў. Паступіў ён на гістарычны факультэт пасля службы ў арміі ў пагранічных войсках. Такіх студэнтаў усе называлі «армейцы». Яны прыкметна вылучаліся ў студэнцкім асяроддзі сваёй выпраўкай, дысцыплінай, добра вучыліся. Бандарэнка закончыў аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю па гісторыі палітычных партый Расійскай імперыі, загадваў кафедрай на гістарычным факультэце. Рухавік! Ён заўсёды быў у нейкіх справах — то навуковых, то вучэбных, то займаўся лецішчам. Кожны, хто да яго набліжаўся, адразу трапляў у ягоны вір. Вось гэту неўтаймоўную энергію яшчэ рэктар Аўласевіч і скіраваў для развіцця новага для ўніверсітэта кірунку — станаўленне ў яго структуры інстытута павышэння кваліфікацыі.

Педагагічны факультэт узначальваў дацэнт Іваноў Валерый Георгіевіч. Мы з ім на фізмаце вучыліся ў адной групе, пяць гадоў сядзелі за адной партай. Вельмі таленавіты і тонкі матэматык, інтэлігент, паэт. Ва ўсім і ўсюды быў гранічна акуратны, можна сказаць, нават скрупулёзны. Бузук у Іванова доўгі час у дэканаце быў намеснікам і, характарызуючы манеру работы Валерыя Георгіевіча, казаў: «Гэта ж трэба — сем разоў адмерае і... ні разу не адрэжа!» Зносіны з Івановым па любых тэмах — ад дыферэнцыяльнай геаметрыі да раскладу заняткаў на яго факультэце — прыносілі задавальненне.

На чале факультэта дашкольнага выхавання была дацэнт Ірына Анатолеўна Камарова. На гэтым факультэце існаваў як быццам жаночы клуб. Літаратурныя вечарыны адпачынку — усё ішло ад калектыву факультэта, і ініцыятарам усіх падобных мерапрыемстваў была Камарова. Яна сфарміравала магутную навуковую школу спецыялістаў дашкольнай адукацыі, іх напрацоўкі ў дадзенай сферы былі вядомыя і выкарыстоўваліся далёка за межамі і ўніверсітэта, і нашай краіны. Я яе часам нават папракаў за перагружанасць вучэбнага працэсу на факультэце. Гаварыў:

— Ірына Анатолеўна, фізмат у маі завяршыў вучэбны працэс, у чэрвені ў іх прайшла экзаменацыйная сесія, ужо ўвесь ліпень гэтыя студэнты працуюць у будатрадах, а вы на факультэце толькі-толькі закончылі вучэбны год?! Няўжо навучанне на факультэце дашкольнага выхавання больш складанае, чым на фізіка-матэматычным факультэце?!

Дэкан Камарова эмацыянальна адстойвала свае пазіцыі:

— Мы рыхтуем спецыялістаў для работы з самымі маленькімі дзецьмі і адносіцца да іх выхавання павінны гэтак жа трапятліва і адказна, як і іх бацькі. Тым больш што ў дашкольным узросце дзіця засвойвае амаль 80 працэнтаў адпушчанай яму па жыцці інфармацыі. Так што вучэбны працэс у дзіцячым садку не прасцейшы, чым на ўроку матэматыкі ў сярэдняй школе.

З дэканам эканамічнага факультэта дацэнтам Алай Міхайлаўнай Сазонавай мы таксама вучыліся на адным курсе і працавалі на адной кафедры. Больш за тое, летам 1972 года працавалі ў Казахстане ў адным будаўнічым атрадзе: я — камандзірам, Ала — камісарам. У адзін час шукалі сябе ў навуцы, вучыліся ў аспірантуры, абараняліся. Яна выйшла замуж за Ігара Сазонава, выпускніка Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута, у будучыні — яго рэктара. Маладыя выкладчыкі ВНУ — Пятроўскія, Івановы, Сазонавы, Радзьковы, — мы былі адной камандай, адных поглядаў і аднаго духу. У гэтай кампаніі Ала Міхайлаўна вызначала для ўсіх арыенціры стрыманасці, самаарганізаванасці, уважлівых адносін, ажно да дробязяў, да даручанай справы. Эканамічны факультэт быў для былога нашага педінстытута з'явай новай, у многім нязвыклай, ён не аддзяліўся ад раней існуючага, а быў адкрыты з нуля. І нам з рэктарам Аўласевічам бачылася, што там патрэбная клапатлівая і ўважлівая гаспадыня. Якая паслядоўна, але настойліва наладзіць вучэбны працэс, сфарміруе здаровы выкладчыцкі калектыў, будзе апекавацца кожным студэнтам. Ала Міхайлаўна падыходзіла да гэтага як ніхто іншы. Думаю, што гэта ў яе ў многім ад мамы, Алены Кузьмінічны. Калі мы збіраліся ехаць з будатрадам на цаліну, яна назірала за нашымі зборамі — рабочая вопратка, канцылярскія тавары для насценгазеты, гітара і баян для агітбрыгады, — нам здавалася, што гэта самыя неабходныя рэчы для жыцця ў тым далёкім краі. А Алена Кузьмінічна гаворыць:

— Вазьміце лепш з сабою мяхоў з дзесяць бульбы, некалькі скрынь тушонкі, макарону!

Як жа мы ёй былі пасля ўдзячныя!

Дэканам майго фізмата амаль дваццаць гадоў быў прафесар Ягор Ягоравіч Сянько. Шэсць гадоў я быў яго намеснікам і тым самым прайшоў школу аднаго з найлепшых дэканаў нашай краіны. Пасля яго на гэтую пасаду па конкурсе прэтэндавалі дацэнт-матэматык Барыс Дзмітрыевіч Чабатарэўскі і дацэнт-фізік Леанід Яўгенавіч Старавойтаў. Фізік у гэтай канкурэнцыі аказаўся мацнейшым. У выніку тайнага галасавання членаў Вучонага савета інстытута перамог Старавойтаў. Леанід Яўгенавіч вучыўся ў аспірантуры Інстытута фізікі АН БССР, ведаў там усіх вучоных і пасля шмат каго з іх прыцягнуў да работы на фізмаце. Гэта прыкметна ўмацавала навуковы бок факультэта, прычым як у фізічным, так і ў матэматычным кірунку. Жонка Старавойтава, Тамара Сулейманаўна, была ў свой час аспіранткай знакамітага прафесара Столяра і працавала дацэнтам кафедры методыкі выкладання матэматыкі, а іх дачка Алена была маёй аспіранткай, таму жыццё фізмата Старавойтавы ведалі ва ўсіх яго праявах, знізу даверху і ў розных плоскасцях. Таму і дэканам Леанід Яўгенавіч працаваў 27 (!) гадоў.

Але адну справу мы з дэканам Старавойтавым да канца ўсё ж такі не давялі. Са скульптарам Андрэем Вараб'ёвым была задумана манументальная скульптура — мадэль Сонечнай сістэмы каля галоўнага вучэбнага корпуса. З велізарнага валуна падымаецца яркае Сонца, а вакол яго на арбітах-святлаводах — усе планеты. На валуне — табліцы з інфармацыяй пра памеры касмічных целаў, адлегласці да іх, гісторыі іх адкрыцця. Вакол — лаўкі, каб сесці і падумаць: хто мы і дзеля чаго ў гэтым Сусвеце. Леанід Яўгенавіч як фізік адразу прыкінуў, што калі Меркурый будзе бачны толькі над каменем, то арбіта Нептуна павінна быць за сотню метраў ад зямлі. У гэтым выпадку я як матэматык прапанаваў не звычайную метрычную, а лагарыфмічную шкалу для агляду ўсіх арбіт. А яшчэ мы хацелі ўстанавіць маятнік Фуко... З розных прычын, але зрабіць тое не змаглі. Да гэтага часу шкадуем — рэктар Радзькоў, дэкан Старавойтаў і скульптар Вараб'ёў.

Падрыхтоўка выкладчыкаў біялогіі і хіміі была для нас справай новай, мы яе пачалі толькі ў канцы васьмідзясятых. Першым дэканам на гэтым факультэце быў дацэнт Вадзім Іванавіч Папоў, вельмі ініцыятыўны, энергічны чалавек, батанік, фармацэўт. Ён дапамог нам стварыць матэрыяльную базу факультэта і сфарміраваў пачатковы педагагічны калектыў. На жаль, рана памёр. У мой час рэктарства дэканам біялагічнага факультэта працавала дацэнт Галіна Мікалаеўна Ціханчук. Яна была аўтарытэтная і як вучоны-біёлаг, і як кіраўнік у ВНУ. Відаць, што біялогія як навука патрабуе ўважлівага і беражлівага стаўлення да жывых істот, ды і ўвогуле да жыцця ва ўсіх яго праявах. Вось і Галіна Мікалаеўна вызначалася спакойнымі і разважлівымі адносінамі да даручанай справы. На факультэце яна была разумнай гаспадыняй. Яны і размяшчаліся ў асобным корпусе — біёлагі, хімікі і географы. І галоўнай у гэтым філіяле была Ціханчук. Калі яна прыходзіла да рэктара з нейкімі праблемамі, то, як правіла, ужо бачыла іх вырашэнне. Ёй патрэбная была толькі адпаведная падтрымка.

Як вучоны-біёлаг, Галіна Мікалаеўна вывучала біёты Верхняга Дняпра, таму ўсе нашы дзелавыя размовы заканчваліся жыццём жужаляў. Гэтыя жукі былі ў Ціханчук у прыярытэце навуковых зацікаўленняў, а я да работы з ёю ўвогуле не здагадваўся аб іх існаванні. А гэта цэлы свет, прытым дзівосна цікавы. Мне часам здавалася, што сваіх жужаляў Ціханчук любіць не менш, чым студэнтаў! А па вялікаму рахунку, студэнты ў сваім выкладчыку, дэкане, рэктары паважаюць найперш захопленага вучонага.

Фізкультурны факультэт у нас пачынаўся як ваенна-спартыўны. Для Савецкай Арміі і для школ Савецкага Саюза мы рыхтавалі камандзіраў мотастралковых узводаў і кіраўнікоў пачатковай ваеннай падрыхтоўкі. Прымалі на вучобу толькі тых хлопцаў, якія адслужылі ў арміі. Дарослыя, самастойныя, шмат у жыцці пабачылі, былі нават тыя, хто ваявалі ў гарачых пунктах. Бурса, а не факультэт. Жыццё ў інстытуце прыкметна ажывілася! У рэктарат адразу пачалі прыходзіць вытрымкі з аператыўных міліцэйскіх зводак: нашы студэнты недзе хуліганілі, ці ладзілі бойкі, ці знаходзіліся ў нецвярозым стане ў грамадскім месцы. На факультэце адкрылася ваенная кафедра, на яе прыйшлі працаваць афіцэры-армейцы, яны больш звычныя камандаваць, чым выкладаць з кафедры ВНУ. Мы абсталяваліся баявымі машынамі, кулямётамі, аўтаматамі. Падрыхтавалі палігоны і ціры для стральбы. Студэнты з афіцэрамі неслі кругласутачныя нарады. Усе студэнты, акрамя ваеннай спецыяльнасці, атрымлівалі права выкладаць у навучальных установах фізічную культуру. Зразумела, што для кіравання такім факультэтам патрабавалася цвёрдая рука. Першым дэканам там быў дацэнт Віктар Іванавіч Зайцаў. Нават вонкава ён рабіў уражанне — у мінулым штурхальнік ядра. Ды і вопыту работы з моладдзю яму было не пазычаць: у свой час ён працаваў першым сакратаром Краснаярскага крайкама камсамола, а ў нас у інстытуце загадваў кафедрай фізічнага выхавання. Пасля яго дэканам быў дацэнт Іван Пятровіч Маракушкін. Ён таксама, як мог, трымаў у руках і развіваў факультэт, працаваў на гэтай пасадзе дзесяць гадоў, але пасля паддаўся перабудовачным настроям і пайшоў у бізнес. Дарэмна, з дэканаў у прадпрымальніцкую дзейнасць сыходзіць нельга, гэта далёкае ад нас асяроддзе. Іван Пятровіч са сваім бізнесам прагарэў, разарыўся, на гэтай глебе захварэў і раптоўна памёр. Шкада, дэканам ён быў цікавым, актыўным. Змяніў яго Уладзімір Іванавіч Пакуш, ён таксама паспяхова спраўляўся з гэтай «арміяй», але яго жонку, былога сакратара Магілёўскага абкама партыі, прафесара Ларысу Уладзіміраўну Пакуш, накіравалі паслом Беларусі ў Казахстан, і ён паехаў з ёю дапамагаць развіваць нашы дыпламатычныя адносіны. Да гэтага часу ўжо падраслі выпускнікі згаданага факультэта. На ім сфарміраваліся навуковыя школы, з'явіліся аспіранты, пайшлі абароны кандыдацкіх дысертацый, калектыў стаў папаўняцца маладымі перспектыўнымі выкладчыкамі. Да такіх адносіўся і Уладзімір Уладзіміравіч Шутаў. Ён і стаў дэканам пасля дацэнта Пакуша. Пры Шутаве факультэт заквітнеў! Ён не толькі забяспечвае прафесійнымі трэнерамі і настаўнікамі фізкультуры спартыўную галіну краіны, але і рыхтуе чэмпіёнаў! Рэспублікі, Еўропы, свету і Алімпійскіх гульняў! Не па адным відзе спорту! І да сёння ўсім гэтым кіруе дэкан Шутаў.

Факультэт замежных моў мы вымушаныя былі адкрыць — у вобласці катастрафічна не хапала настаўнікаў гэтага профілю. Дэканам мы туды прызначылі дацэнта Уладзіміра Уладзіміравіча Ясева, палітолага. Але мы яго ведалі як вельмі разважлівага і адказнага чалавека, ды яшчэ і паэта. Не памыліліся — ён сфарміраваў факультэт, стаў прарэктарам па вучэбнай рабоце і членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вось якая ў мяне была кагорта дэканаў!

**Пераклаў з рускай мовы**
**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 23 ліпеня.)*

***(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня, 9 ліпеня.)***

---

Яўген КАРНЯГ:

# «СТАЎ ЛЕПШЫМ АКЦЁРАМ, КАЛІ ПАЙШОЎ У РЭЖЫСЁРЫ»

**Яго прозвішча — ужо амаль як асобны брэнд. Насамрэч Яўген Карняг — сапраўды асаблівая з'ява ў беларускім тэатры. Рэжысёр з уласным падыходам, стылем, светаадчуваннем. І трымаўся неяк асобна: з рознымі тэатрамі супрацоўнічаў, прычым як у блізкім, так і ў далёкім замежжы. Але нідзе не быў стала. Яго творчая свабода была залогам таго, што адметны спектакль мог з'явіцца ў любым горадзе Беларусі, дзе ёсць тэатр. Але цяпер ён стаў рэжысёрам Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.**



***— У вашых спектаклях выразны аўтарскі стыль — ад сцэнаграфіі, святла да пластычнага выказвання. Што больш істотна спрацавала ў гэтых пошуках: інтуіцыя ці знаёмства з тым, што адбываецца ў сусветным тэатры?***

— Я з тэатрам яшчэ са школы — вучыўся ў тэатральным класе. І тады ўжо было адчуванне, што я хачу нешта рабіць сам. Калі яго візуалізаваць: быццам бы на сцэне разрываю падушку — і ляціць пер'е... Адчуванне было, а як зрабіць, яшчэ не ведаў. А калі паступіў у Акадэмію мастацтваў, паглядзеў практычна ўсе спектаклі ў Мінску. Калі вучыўся, запісаўся ва ўсе бібліятэкі, у тым ліку замежныя. Праглядаў усё, што ёсць у іх на відэа па тэатры, больш увагі звяртаў на балет ці танец — больш можна зразумець, калі не ведаеш, напрыклад, нямецкай мовы, а глядзець складаную драматургію няпроста без перакладу. Дзякуючы таму, што мы вучыліся ў Аляксея Анатолевіча Ляляўскага, мелі магчымасць працаваць з яго студэнтамі-рэжысёрамі і часам стваралі спектаклі адмыслова для еўрапейскіх фестываляў. Будучы студэнтамі, выязджалі на добрыя тэатральныя фестывалі, бачылі, што там з'яўляецца. Была цікавасць да рэжысёраў кіно. Яшчэ да акадэміі глядзеў усё, што ішло па тэлебачанні. Аднойчы па адным з беларускіх тэлеканалаў паказвалі арт-хаус. Памятаю, калі ўбачыў фільм Пітэра Грынуэя — гэта быў выбух мозга. Потым стала магчыма знайсці дыскі з фільмамі найлепшых рэжысёраў свету... Спачатку назапашваеш інфармацыю, а потым яна пачынае працаваць у табе, перацякае ва ўласныя знаходкі і формы. Натуральна, работа з адным з найлепшых мастакоў Беларусі дае свой плён.

***— Для большасці гледачоў тэатр — гэта тэкст, які прамаўляецца са сцэны. А вы прыйшлі да спектакляў, дзе тэксту ў выглядзе драматургіі няма, — з'яўляецца больш абстрактнасці праз пластыку. Не баяліся быць незразумелым для шырокай публікі?***

— Ведаю, што часта людзі бачаць назву, але не разумеюць, хто такі рэжысёр і навошта ён патрэбны... Але ў мяне заўсёды ёсць пытанне да самога сябе: ці маю права нешта рабіць і нешта паказваць? Было важна спачатку набіваць руку і вучыцца, каб я сам пераканаўся, што магу сачыняць сваё і маю права называцца рэжысёрам. Я сам сабе гэта даказваю, і калі разумею, што ёсць вынік, тады бяруся за драматургію — напрыклад, рабіў Метэрлінка ў Маскве, калі вучыўся, ці пазней увасабляў Бабеля ў блізкім замежжы. Таксама звяртаўся да твораў Булгакава і Гогаля. У Дзяржаўным тэатры лялек узнікла «Інтэрв'ю з ведзьмамі» — паводле казак братоў Грым. Калі я працую з драматургіяй альбо літаратурай, стараюся выкарыстоўваць як мага больш тэксту, каб як найдакладней перадаць сутнасць, хоць усё роўна гэта маё бачанне і мая мова. Але я не буду пераварочваць і рабіць тое, чаго не напісана, напрыклад, у Булгакава. Ёсць такія прыёмы, калі рэжысёры, каб быць арыгінальнымі, даюць зусім нечаканае прачытанне. Калі я бяру аўтара, то таму, што ён мне цікавы. Калі мяне нешта ў матэрыяле не задавальняе, тады я павінен адмежавацца і выбраць больш абстрактную форму.

***— Вы вучыліся для работы ў тэатры лялек, а ставіце спектаклі ў драматычных тэатрах. У нас у Беларусі на нейкім этапе «лялечнікі» сталі задаваць тон у тэатры. Ці ёсць тлумачэнне, чаму так атрымалася?***

— Так, ёсць: Аляксей Анатолевіч Ляляўскі. Гэта майстар, які ўстаўляе мазгі. Ён тлумачыць галоўнае: навошта, што, чаму адбываецца. Мне падабаецца, што ён дазваляе кожнаму быць сабой, а не робіць з іх нашчадкаў, якія трымалі б выключна яго лінію. Аляксей Ляляўскі нам паказаў, што рэжысёры могуць ствараць сусветы. Ён вывозіў нас на фестывалі, каб было разуменне сучаснага тэатральнага працэсу. І як ён сам робіць аналіз і выбар матэрыялу — таксама мае значэнне. І тэатр лялек насамрэч дае нашмат больш магчымасцяў.

***— Чаму вы ўсё ж вырашылі пайсці ў рэжысуру?***

— Я зразумеў, што работа акцёра над роллю — гэта складана. А ў рэжысуры мне не складана. Уначы прыйшла думка — уключаешся, шукаеш, сачыняеш... Я атрымліваю большае задавальненне, калі знаходжуся ў глядзельнай зале як рэжысёр, чым калі на сцэне як акцёр. У мяне было заўсёды адчуванне дыскамфорту. І цяпер разумею, што я стаў лепшым акцёрам, калі перайшоў у рэжысёры.

***— У спектаклі «Пачупкі», што ідзе ў РТБД, прастора жывая, яна «дыхае». Як нараджаюцца падобныя вобразы?***

— Нагледжанасць мае значэнне. Калі мы з Таняй Нерсісян абмяркоўваем тэму, над якой працуем, то шукаем матэрыял, настрой, уражанне ў нейкіх фотаздымках, кліпах, роліках. Пакеты, якія «дыхаюць» — ідэя з мастацкай выстаўкі, не мной прыдуманая. Але ў спектаклі яно спрацавала інакш. Ці ёсць фотамастак, які робіць чорнае на чорным фоне — і мне падабаецца, калі шмат фактур аднаго колеру. Таму для мяне гэта быў амбіцыйны праект — прыбраць увесь колер, акрамя чорнага.

У спектаклі «Шлюб з ветрам» — колеры чорныя з белым. Але пасля яго ў мяне з'явілася адчуванне няскончанасці. «Пачупкі» — працяг той размовы і другая частка. Але насамрэч гэта будзе трылогія. І пасля першага спектаклю два наступныя раскладваю на два спектры. Чорны ў «Пачупках» — аб'ядноўвае. А ў трэцяй частцы асноўны белы — увасабленне таго, што раз'ядноўвае: гэта будзе спектакль на тэму смерці. Мы прынцыпова вызначыліся з адчуваннем колераў, аднак там не будзе такога фанатычнага прытрымлівання аднаго колеру.

***— Такое адчуванне, што ў вас усё дакладна пралічана, але цікава, якую ролю адыгрываюць у гэтым праекце ўласныя эмоцыі?***

— Паколькі я ўсё прапускаю праз сябе, то вызначыў, што першы спектакль «Шлюб...» — пра маю маму. Другі спектакль — пра маю сястру, якая вельмі хацела дзіця, таму тут усё завязанае на жаночую гісторыю: калыска, любоў да немаўляці, боязь страціць дзіця, хвароба, якая забірае дзіця, бясплоднасць, пакуты маці за дзяцей... А трэці спектакль натхнёны маёй бабуляй. У нас род у асноўным жаночы, і ён фактычна вымірае. Таму што з вялікай сям'і, якая была, засталіся толькі мы, хочацца гэта захаваць ва ўражаннях. Памятаю, калі я прыдумваў сцэнаграфію, то ведаў, што будзе ў дзвюх ячэйках — а ўсяго іх дзесяць. Чым напоўніць іншыя? Пачынаю распытваць у мамы пра нашу сям'ю. І даведаўся, што ў маёй бабулі з вайны не вярнуліся 8 братоў — а ў мяне столькі ж пустых ячэек. Зразумеў, што трэба ісці ад сваіх вытокаў. Стаў вывучаць радавод. Мне здаецца, што ў Беларусі шмат у каго сямейныя гісторыі падобныя, асабліва пасля Другой сусветнай. А ў беларускіх народных песнях — увесь векавы сум, усе надзеі і сямейныя клопаты. Таму яны — падмурак для ўсёй трылогіі. Мы столькі адметных песень знайшлі! У нас жа ў асноўным, калі гаворка пра беларускія песні, усе спяваюць «Купалінку». Але гэта не народная песня, яна аўтарская. Прытым, што ў нас бязмежныя скарбы фальклору. Калі мы выбіралі песенны матэрыял на другую частку, то адразу падбіралі і на трэцюю. Узялі палескія песні — у іх адметны каларыт — і яны далі спектаклю асаблівую, вельмі моцную энергетыку, якая нясе адчуванне зямлі і лёсу.

...У дзяцінстве мяне часта выпраўлялі да бабулі ў вёску. Побач з нашай вёскай за кіламетры тры была іншая, якой сёння няма. А туды часам даходжу і адчуваю, як паступова чалавечае жыццё сыходзіла адтуль. Але нават здалёк відаць, што там была вёска — па лініі лесу: яна ў асноўным роўная, а там, дзе жылі людзі, растуць іншыя дрэвы — ад сліў да дубоў. Нават калі знікае жыццё, то ўсё роўна чалавек пакідае пасля сябе след. Хоць бы ў выглядзе адметнага ландшафту, нягледзячы на тое, што прырода хутка адваёўвае сваё... І шмат рэчаў з таго колішняга жыцця будзе ў спектаклі. Мне падабаецца прыём, які быў у Кантара — ён выбудоўваў спектаклі са сваіх уражанняў. Натуральна, я раблю інакш. Але тое, што я як рэжысёр бяру дакладныя вобразы, якія існавалі ў маёй вёсцы і ў маёй краіне, на сцэне набывае большы сэнс, чым выдуманая чужая гісторыя.

***— У «Пачупках» ёсць спалучэнне гарадской суперстыльнай эстэтыкі з народнай асновай. Але ці можна гэтым аб'яднаць нашу такую розную публіку?***

— Мне падабаецца гэтак рабіць, і лічу, што гэта неабходна. Таму што нацыянальны тэатр — гэта не толькі беларуская літаратура і драматургія пра тую далёкую вёску, якую сучасныя людзі ўжо не памятаюць. Як гістарычны пласт гэта ёсць. Але цяпер і вёска іншая, а што казаць пра горад... Мне было цікава рабіць беларускі тэатр цяпер і прыўнесці туды горад. Яго ў нашай нацыянальнай літаратуры мала. Але ў жыцці — большасць насельніцтва ўжо гараджане. Натуральна, трэба шмат чытаць, шукаць асаблівую мову, як перадаць спрадвечныя тэмы і сучасныя ўспрыманні. У мяне не будзе лёну на сцэне, хоць гэта здаецца натуральным, калі гаворка пра беларускі каларыт. Але зусім іншая эстэтыка касцюма, калі артысты ў класічных строях выйшлі ў «Шлюбе...». Не будзе лапцяў — цяпер гэта неактуальна, а калі хочацца паглыбіцца ў гісторыю — ёсць музей. Тэатр усё ж пра іншае. Я чуў шмат калектываў, якія спяваюць беларускія народныя песні. Мала хто настолькі класна іх адаптуе, што гэта цікава слухаць у наш час. А калі сучасны чалавек пачынае спяваць, як нашы бабулі ці дзядулі, то атрымліваецца штучна. Бо яны жылі з гэтымі песнямі, працавалі пад іх, кахалі, паміралі... На мой погляд, цяпер, каб выканаць беларускую народную песню, яе трэба пераасэнсаваць, перапрацаваць, выбраць галоўнае — каб яно загучала. А калі робіш «нібыта так» — то гэта атрымліваецца зусім не так. Нашы продкі не хадзілі ў музычныя школы, каб навучыцца спяваць, іх голас ішоў знутры. Таму гэта трэба нечым кампенсаваць, прыдумаць, як стылізаваць, каб прагучала і было цікава сучаснаму чалавеку. Мне хочацца працаваць з беларускім матэрыялам, і я разумею, што ён немагчымы больш нідзе, толькі тут..

***— Але ж вашы спектаклі без слоў — універсальныя, ці не так?***

— Сутнасць — беларуская душа — будзе зразумелая паўсюль. Гэта галоўнае, не столькі бязмоўнасць. Насамрэч я бязмоўна пачынаў, а цяпер больш звяртаюся да літаратуры. Драматургія мяне не вельмі цікавіць — ні Чэхаў, ні Шэкспір, таму што іх занадта шмат. Памятаю, калі праходзіў стажыроўку ў Лондане, аднойчы ўзнікла пытанне: што б вы памянялі ў англійскім тэатры? Адна дзяўчына сказала, што на 5 гадоў забараніла б ставіць Шэкспіра — каб адпачыць ад яго... І ў мяне ёсць такое адчуванне. Але літаратура — іншае. Калі бярэш для ўвасаблення раман, то нашмат большае поле для стварэння спектакля — пішаш інсцэніроўку, выступаеш як аўтар. Цяпер у мяне няма прыхільнасці да тэатра без слоў. Але зразумела, калі спектакль без слоў, яго прасцей павезці на міжнародны фестываль.

***— Вы былі лаўрэатам Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Вас апрыёры запісваюць у эксперыментальны тэатр. Пагаджаецеся, што гэта будзе ваша катэгорыя па жыцці?***

— Я даўно зразумеў, што калі едзеш на фестываль накшталт магілёўскага «М@рт-кантакту», добры спектакль — гэта той, што створаны па ўсіх канонах. Але вось Карняг — нешта асаблівае. Таму для яго трэба прыдумаць асаблівую прэмію — толькі не плач... Цябе адзначылі, але па законах тэатра твой спектакль не можа стаць найлепшым. Але мне ўсё роўна. Таму што тэатр мяняецца настолькі хутка, і сёння сумяшчаецца шмат эталонаў, адбываецца больш змен, чым можна прыдумаць намінацый на фестывалі. Што такое «эксперыментальны спектакль»? Твор мастацтва і павінен спрабаваць новыя хады, прапаноўваць новыя эстэтыкі — то-бок быць па сутнасці эксперыментальным. Я не працую для прэміі. Мая задача — стварыць спектакль, які будзе падабацца мне і на які людзі захочуць схадзіць не адзін раз.

***— Вы працавалі ў розных краінах, але застаяцеся прывязаныя да Беларусі. Для вас гэта важна?***

— Так, тут карані. Рэжысёраў жа сотні — і вельмі крутых. Але самае цікавае — калі адчуваецца нацыянальнасць, ідэя. Напрыклад, Еўропа вельмі розная, але мы разумеем, у чым адметнасць кожнай краіны. Маленькія тэрыторыі маюць свой каларыт. А каму ты патрэбны ў іншай краіне? Можна зрабіць адзін праект, другі. Але мне складана ўявіць сябе ў іншай краіне, бо ўсё роўна я буду прадстаўніком беларускай культуры, беларускага тэатра. Магчыма, калі ты вядомы на ўвесь свет, калі не паспяваеш вяртацца дадому, як Боб Уілсан — ездзіць і ставіць у розных краінах — то становішся ўніверсальным...

Важна і тое, што ў сябе дома ты маеш права гаварыць на любую тэму, чаго няма ў іншых краінах, дзе ты можаш не ведаць сутнасць праблем, у адносінах да якіх трэба быць вельмі далікатнымі. Тут я свой, маю думкі, якімі хачу падзяліцца з людзьмі, якія мяне павінны зразумець. І ў мяне ёсць адчуванне, што зямля вельмі сілкуе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ОАО «Статусбанк»

www.stbank.by

# Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2021 года

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

| | Примечания | 31 декабря 2021 года | 31 декабря 2020 года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 6 | 14 078 | 16 789 |
| Средства в финансовых организациях и Национальном банке | 7 | 625 | 1 547 |
| Кредиты финансовым организациям под залог ценных бумаг | 8 | 16 646 | - |
| Кредиты клиентам | 9 | 59 176 | 59 898 |
| Основные средства, нематериальные активы, активы в форме права пользования | 10 | 4 538 | 5 676 |
| Текущее требование по налогу на прибыль | | 631 | 485 |
| Прочие активы | 11 | 264 | 180 |
| **ИТОГО АКТИВЫ** | | **95 958** | **84 575** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | | | |
| **Обязательства** | | | |
| Средства финансовых организаций | 12 | 3 000 | - |
| Средства клиентов | 13 | 16 358 | 10 333 |
| Обязательство по текущему налогу на прибыль | | 1 | 212 |
| Обязательства по отложенному налогу на прибыль | 23 | 1 099 | 791 |
| Прочие обязательства | 14 | 3 100 | 3 834 |
| **Итого обязательства** | | **23 558** | **15 170** |
| **Капитал** | | | |
| Уставный капитал | 15 | 52 817 | 52 817 |
| Нераспределенная прибыль | | 19 583 | 16 588 |
| **Итого капитал** | | **72 400** | **69 405** |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | | **95 958** | **84 575** |

## ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ

| | Примечания | 2021 | 2020 |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | 16 | 9 904 | 11 397 |
| Процентные расходы | 17 | (276) | (1 839) |
| **Чистые процентные доходы** | | **9 612** | **9 558** |
| Комиссионные доходы | 18 | 1 753 | 4 564 |
| Комиссионные расходы | 19 | (770) | (2 170) |
| **Чистые комиссионные доходы** | | **983** | **2 394** |
| Чистые доходы по операциям иностранной валютой | 20 | 1 256 | 4 196 |
| Прочие доходы | 21 | 1 564 | 2 720 |
| **Операционные доходы** | | **13 431** | **18 868** |
| Административные расходы | 22 | (11 176) | (15 624) |
| Восстановление резервов под обесценение финансовых активов | 6-9, 11 | 1 189 | 324 |
| Восстановление (создание) резервов по обязательствам кредитного характера | | (2) | 26 |
| **Прибыль до налогообложения** | | **3 442** | **3 594** |
| Расходы по налогу на прибыль | 23 | (447) | (800) |
| **Чистая прибыль за отчетный год** | | **2 951** | **2 794** |
| **Прочий совокупный доход / (расход)** | | - | - |
| **Итого совокупный доход** | | **2 995** | **2 794** |
| **Базовая прибыль на простую акцию** | **15.1** | **0,0132** | **0,0123** |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ

| | Примечания | Уставный капитал | Нераспределенная прибыль | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|
| **Остаток на 31 декабря 2019 года** | | **52 817** | **13 794** | **66 611** |
| Чистая прибыль за отчетный год | | - | 2 794 | **2 794** |
| **Итого совокупная прибыль за отчетный год** | | - | **2 794** | **2 794** |
| **Остаток на 31 декабря 2020 года** | 15 | **52 817** | **16 588** | **69 405** |
| Чистая прибыль за отчетный год | | - | 2 995 | **2 995** |
| **Итого совокупная прибыль за отчетный год** | | - | **2 995** | **2 995** |
| **Остаток на 31 декабря 2021 года** | 15 | **52 817** | **19 583** | **72 400** |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ

| | Примечания | 2021 | 2020 |
|---|---|---|---|
| ***Операционная деятельность*** | | | |
| Проценты полученные | | 9 906 | 11 763 |
| Проценты уплаченные | | (274) | (2 023) |
| Комиссии полученные | | 1 667 | 4 804 |
| Комиссии уплаченные | | (770) | (2 170) |
| Реализованный результат по операциям с иностранной валютой | | 2 003 | 3 674 |
| Расходы на персонал уплаченные | | (3 808) | (5 854) |
| Уплаченные административные расходы | | (6 390) | (9 027) |
| Прочие доходы | | 1 550 | 2 703 |
| **Движение денежных средств от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **3 884** | **3 870** |
| *(Увеличение) / уменьшение операционных активов:* | | | |
| Обязательные резервы на счетах в НБ РБ | | - | 455 |
| Средства в финансовых организациях и Национальном банке | | 944 | (1 101) |
| Кредиты финансовым организациям под залог ценных бумаг | | (16 565) | - |
| Кредиты клиентам | | 1 095 | 12 157 |
| Прочие активы | | 2 | 149 |
| *Увеличение / (уменьшение) операционных обязательств:* | | | |
| Средства финансовых организаций | | 3 000 | (81) |
| Средства клиентов | | 6 490 | (82 313) |
| Прочие обязательства | | 181 | (177) |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности до налогообложения** | | **(969)** | **(67 041)** |
| Налог на прибыль уплаченный | | (500) | (993) |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности** | | **(1 469)** | **(68 034)** |
| ***Инвестиционная деятельность*** | | | |
| Погашение / (приобретение) финансовых активов, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | | - | 10 114 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (750) | (680) |
| Продажа основных средств | | 38 | 643 |
| **Чистое движение денежных средств, использованных в инвестиционной деятельности** | | **(712)** | **10 077** |
| ***Финансовая деятельность*** | | | |
| Поступления от выпуска / (выплаты по погашению) долговых ценных бумаг | | - | (3 794) |
| Чистое движение денежных средств от финансовой деятельности | | - | (3 794) |
| **Чистое увеличение / (уменьшение) денежных средств и их эквивалентов** | | **(2 181)** | **(61 751)** |
| Влияние курсовых разниц на денежные средства и их эквиваленты | | (515) | 2 115 |
| Изменение оценочного резерва под ожидаемые кредитные убытки | | (17) | 36 |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало года** | **6** | **16 791** | **76 389** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец года** | **6** | **14 078** | **16 789** |

Прилагаемые примечания на страницах с 13 по 68 являются неотъемлемой частью настоящей финансовой отчетности.

Исполняющий обязанности Председателя Правления Кожевников Д.Е.

Главный бухгалтер Лаврович Е.М.

г. Минск, 27 мая 2022 года

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24 декабря 2021 года.*

ФБК

## ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА

Исх. № 05-01/74 от «27» мая 2022 года

*Наблюдательному Совету и Правлению Открытого акционерного общества «Статусбанк»*

**Мнение**

Мы провели аудит прилагаемой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Статусбанк» (далее – Банк), состоящей из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2021 года, отчета о совокупном доходе, отчета об изменениях в капитале и отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к финансовой отчетности, включая краткий обзор основных положений учетной политики.

По нашему мнению, финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2021 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (далее – МСФО).

**Основание для выражения мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, Международными стандартами аудита (далее – МСА). Наша ответственность в соответствии с этими правилами и стандартами описана далее в разделе «Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности» данного аудиторского заключения.

Мы независимы по отношению к Банку в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров Совета по международным стандартам этики для бухгалтеров (далее – Кодекс СМСЭБ) и этическими требованиями, применимыми к нашему аудиту финансовой отчетности в Республике Беларусь, и нами выполнены прочие этические обязанности в соответствии с Кодексом СМСЭБ.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения.

**Ключевые вопросы аудита отчетности**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой финансовой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах.

Резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам клиентам в соответствии с МСФО 9 «Финансовые инструменты»

В связи со значимостью кредитов клиентам и важностью профессиональных суждений и оценок, которые используются в отношении оценки ожидаемых кредитных убытков в соответствии с стандартом МСФО 9 «Финансовые инструменты» данный вопрос является ключевым вопросом аудита.

Выявление признаков обесценения, факторов значительного увеличения кредитного риска, определение значений вероятности дефолта и уровня потерь при дефолте, определение возмещаемой стоимости и прогнозирование макроэкономических показателей являются процессом, который включает значительное использование профессионального суждения.

Оценка резерва под ожидаемые кредитные убытки предполагает использование методик оценки, включая внутренние кредитные рейтинги для определения вероятности дефолта, исторические данные для определения уровня потерь при дефолте, а также прогнозирование макроэкономических показателей. Факторы значительного увеличения кредитного риска также носят субъективный характер и основаны на увеличении кредитного риска по внутренним рейтингам, длительности просроченной задолженности и иных показателях.

Использование различных моделей и допущений может существенно повлиять на уровень резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам клиентам.

Примечание 3 «Принципы подготовки финансовой отчетности», Примечание 5 «Основные принципы учетной политики», Примечание 9 «Кредиты клиентам», Примечание 24 «Управление рисками», включенные в финансовую отчетность, содержат информацию о резерве под ожидаемые кредитные убытки, а также подход руководства к оценке и управлению кредитным риском.

В ходе наших аудиторских процедур мы рассмотрели и оценили методики Банка по оценке резервов под ожидаемые кредитные убытки по кредитам, предоставленным юридическим и физическим лицам.

Мы рассмотрели факторы кредитного риска, используемые Банком для определения значительного увеличения кредитного риска.

Мы проанализировали рейтинговые модели, ключевые исходные данные и допущения, а также модели вероятности дефолта, уровня потерь при дефолте, корректировки их с учетом макроэкономических прогнозов, используемые для расчета ожидаемых кредитных убытков.

Мы протестировали (на выборочной основе) модели оценки выбранных нами кредитов. Наша работа включала оценку, являются ли модели и использованные данные приемлемыми, повторение отдельных расчетов, а также различные аналитические и другие процедуры.

Мы проанализировали информацию о резерве под ожидаемые кредитные убытки по кредитам клиентам, раскрытую в примечаниях к финансовой отчетности.

**Ответственность руководства и лиц, отвечающих за корпоративное управление, за финансовую отчетность**

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и справедливое представление данной финансовой отчетности в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, а также за систему внутреннего контроля, необходимую, по мнению руководства, для подготовки финансовой отчетности, которая не содержит существенных искажений в результате недобросовестных действий или ошибок.

При подготовке финансовой отчетности руководство несет ответственность за оценку способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Банк, прекратить его деятельность или когда отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, отвечающие за корпоративное управление, несут ответственность за надзор за подготовкой финансовой отчетности.

**Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, МСА, всегда выявляет существенные искажения при их наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой финансовой отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, МСА, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка;
- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность бухгалтерских оценок и соответствующего раскрытия информации, подготовленного руководством;
